***Войцах Томчык***

# Нюрнберг

<u>*Дзейныя асобы:*</u>
**Палкоўнік**
**Анка**
**Жонка**

## Сцэна 1

*Кватэра ў жылым блоку. З правага боку на прасцэніуме – прыхожая: уваходныя дзверы з некалькімі замкамі, вешалка для вопраткі з іклаў дзіка, домафон, шафка для абутку. Далей – гасцёўня: часопісны столік, бібліятэка ў сценнай кніжнай шафе, тэлевізар, відэамагнітафон, крэслы, канапа. На паліцах у секцыі – бакалы, лямпа з гільзы ад танкавага снарада, мадэль ваеннага верталёта. Кнігі на паліцы: гістарычныя і біяграфічныя серыі. На падлозе ляжаць шкуры дзіка і барсука. На сцяне вісіць старасвецкі гадзіннік з кукушкай. Кожныя пятнаццать хвілін гадзіннік б'е чатыры гадзіны – і ніколі па- іншаму. На сцяне развешана калекцыя влоцлаўскіх талерак. Каля сцяны стаіць акварыум: без рыбак, пясок, каменчыкі, шнурок бурбалак паветра. Далей – двое дзвярэй у іншыя пакоі. Першыя – звычайныя дзверы шматкватэрнага дома, зашклёныя матавым шклом. Шкло даўно трэснула ад скразняку і заклеена скотчам. Другія дзверы падобныя на ўваходныя – два замкі і вочка.*

*З левага боку на прасцэніуме – кухня. На стале, засланым абрусам, дзве старыя электрапліткі з чорнымі круглымі дыскамі. Электрычны чайнік. Дзве падвесныя шафкі, дзве вешалкі, два ручнікі, дзве сушылкі для посуду, адрыўны каляндар.*

*Б'е гадзіннік з кукушкай. З-за зашклёных дзвярэй у пакой уваходзіць ПАЛКОЎНІК – мужчына ў гадах. Худы, падцягнуты, стройны. На ім штаны і кашуля, на нагах – тапачкі. Ён садзіцца ў крэсла, бярэ газету, уключае радыё. Гучыць каталіцкае... "Радыё Марыі". ПАЛКОЎНІК выключае радыё, складвае газету, кідае яе на часопісны стол. Падыходзіць да камоды і вымае з шуфлядкі блакнот, чарніліцу і вечнае пяро. Зноў садзіцца ў крэсла, запраўляе пяро, ці то аўтаручку. Адстаўляе чарніліцу, устае і выходзіць у пакой за зашклёнымі дзвярмі. Вяртаецца, на хаду апранаючы пінжак. Адмыкае бар. Бар пусты – у ім усяго толькі некалькі чарак. У глыбіні бара – люстэрка. ПАЛКОЎНІК з цяжкасцю спрабуе разгледзець сябе ў ім – ад ног да галавы. Замыкае бар і выходзіць у пярэдні пакой. Адмыкае ключом шафку, дастае пару карычневых туфляў ад параднага ваеннага мундзіра. З дапамогай лыжкі для абутку абувае туфлі. Тапачкі і лыжку хавае ў шафку. Замыкае яе ключом, які вісіць сярод даволі вялікай вязкі. Хавае ключы ў кішэню. Садзіцца, працірае туфлі папяровай сурвэткай.*

**Палкоўнік.** Вы ведаеце, што такое "Асвенцымская хлусня"?.. Або "Хлусня Аўшвіца?.." Вы хоць ўяўляеце, што гэта такое?

*ПАЛКОЎНІК рэпеціруе словы, спачатку проста бубніць іх, потым прамаўляе іх голасна, пазіраючы на крэсла, што стаіць перад ім.*

**Палкоўнік.** Вы ж чулі аб гэтым што-небудзь? Ведаеце, што "Асвенцымская хлусня" каральная, нават у нас?.. Асабліва ў нас.

*Званок у дзверы. Палкоўнік рэзка ўстае, выходзіць у прыхожую, бярэ трубку домафона, гаворыць старэчым голасам.*

**Палкоўнік.** Та-ак... Дабрыдзень... Так, заходзьце...

*Націскае на кнопку домафона, вешае трубку на месца, потым зноў прыкладае да вуха і запознена крычыць.*

**Палкоўнік.** Дзевяты паверх!.. Дзевяты!..

*Адмыкае замкі ўваходных дзвярэй, адчыняе іх, выглядвае ў калідор. На ручцы вісіць каляровая рэкламка. Ён зрывае яе, зачыняе дзверы, падыходзіць да смеццевага вядра і выкідае рэкламку.*

**Палкоўнік.** Вы ведаеце, што такое “Хлусня Аўшвіца”? Вам гэта вядома?

*Садзіцца, пазірае на гадзіннік, устае, падыходзіць да дзвярэй, прыслухоўваецца, зноў падыходзіць да стала, папраўляе аўтаручку, вяртаецца да дзвярэй. Слухае. Праз хвілінку чуецца званок. Палкоўнік крычыць углыб кватэры.*

**Палкоўнік.** Хвілінку, ужо іду…

*Некалькі разоў шаркануў туфлямі, стоячы на месцы. Глядзіць у вочка.*

**Палкоўнік.** Зараз…Зараз!

*Некалькі разоў шоргае засаўкай, адчыняе дзверы. За імі – Анка.*

**Анка.** Дабрыдзень, пан палкоўнік. Гэта я.

**Палкоўнік.** Добры дзень. Бачу, што вы. Праходзьце, калі ласка.

*Анка ўваходзіць у прыхожую, азіраецца, працягвае яму руку.*

**Анка.** Добры дзень, пан палкоўнік. Ганна Стахофска…

*Палкоўнік выглядвае ў калідор, крычыць некаму.*

**Палкоўнік.** І вам добрага дня, дарагія суседзі!

*Зачыняе дзверы, зноў глядзіць у вочка.*

**Палкоўнік.** Узялі прозвішча мужа? Добры дзень. Каладзей. Стэфан Каладзей.

**Анка.** Так, прозвішча мужа. Цяпер, калі вярнуць дзявочае, давядзецца нанава прывучаць да яго чытачоў, ды і рэдактараў таксама.

**Палкоўнік:** Я чытаў бы вашы матэрыялы нават калі б вы падпісваліся Ганна Візнер.

**Анка:** Не ўсе маюць такую інфармацыю, пан палкоўнік.

**Палкоўнік:** Але ж вы не робіце тайну са свайго дзявочага прозвішча? Праўда? Прысаджвайцеся, прашу вас. Час у нас ёсць.

*Адпускае яе рукі, паказвае на крэсла, садзіцца.*

**Палкоўнік:** А вы ведаеце, што такое… Вы… Можа, чай, каву?

**Анка:** Каву, калі можна. А то ціск… Ну і надвор'е ж сёння…

**Палкоўнік:** Кава нам не пашкодзіць. Так, бясспрэчна. А мо што-небудзь мацней?

*Устае, ідзе на кухню, правярае ці ёсць вада ў чайніку, далівае вады з крыху мутнай пластыкавай бутэлькі, уключае чайнік, з шафкі бярэ каву, насыпае ў кубачкі па дзве лыжачкі, ставіць слоік з кавай на месца, зачыняе шафку, падыходзіць да бара, бярэ адтуль шкляную цукарніцу, ставіць на стол. Вада ў чайніку закіпае. Залівае кіпенем каву, апускае ў кубачкі лыжачкі, накрывае кубачкі сподачкамі. Ставіць на стол талерку з пячэннем. Садзіцца.*

**Анка:** Не, дзякуй, я на машыне. Тут не крадуць?

**Палкоўнік:** Крадуць? Рэдка. Найчасцей ноччу. Вы не спазніліся.

**Анка:** Ну так…

**Палкоўнік:** Гэта, я лічу, вельмі важна. Можа, нават дужа важна. Ведаеце, калісьці казалі, што ёсць дзве асноўныя прыметы бальшавізацыі. Першая – непунктуальнасць. Калі ласка, чым багаты…

**Анка:** А другая? Якая другая прыкмета бальшавізацыі?

**Палкоўнік:** Ну, гэта калі чалавек радуецца, што некаму горш, чым яму. Вы вось радуецеся, калі некаму горш, чым вам?

**Анка:** Не, навошта…

**Палкоўнік:** Вось бачыце, значыць вы поўнасцю свабодная ад камунізму. Камуна вас не кранула нават. Абсалютна. А пра мяне вы як даведаліся?

*Устае, ідзе на кухню, ставіць кубачкі на сподкі, мые лыжачкі, вяртаецца да століка.*

**Палкоўнік.** Частуйцеся.

**Анка.** Дзякуй, я без цукру. Гэта вы так казалі? І вашы знаёмыя?

**Палкоўнік.** Не саромейцеся, цукар ёсць… Што казаў?

**Анка.** Я п'ю без цукру. Пра бальшавізацыю. Што нехта бальшавізаваны, а нехта не.

**Палкоўнік.** З цукрам лепей. Без цукру кава нясмачная. Не саромейцеся. Цукру ў мяне хапае. Не, ну адкуль, я так нават не думаў.

**Анка.** Але я, праўда, п'ю без цукру.

**Палкоўнік.** Неверагодна. Упершыню бачу чалавека, які п'е каву без цукру… У вас дыябет?

**Анка.** Не, проста не п'ю з цукрам. Але каб у вас вяршкі былі…

**Палкоўнік.** Вяршкі? Вяршкі, значыць?

**Анка.** Калі вас гэта не абцяжарыць.

**Палкоўнік.** Ніколькі. Вяршкі, вяршкі, вяршкі? Вяршкі ў халадзільніку ёсць. Я зараз.

*Устае, ідзе ў пакой з зашклёнымі дзвярмі. Анка, карыстаючыся яго адсутнасцю, дастае з сумкі дыктафон, ставіць на столік, уключае, робіць пробны запіс.*

**Анка.** Аўторак, дванаццатага кастрычніка, гутарка з палкоўнікам Стэфанам Каладзеем, адстаўным афіцэрам ваеннай контрразведкі, кватэра палкоўніка.

*Спыняе запіс, перамотвае, уключае.*

**Анка** *(з дыктафона).* Аўторак, дванаццатага кастрычніка, гутарка з палкоўнікам Стэфанам Каладзеем, адстаўным афіцэрам ваеннай контрразведкі…

*Спыняе запіс, бо вяртаецца Палкоўнік з вяршкамі ў фарфоравым збаночку.*

**Палкоўнік.** Запісваць хочаце? Але мы так не дамаўляліся.

**Анка**. Вы супраць? Можам не запісваць

**Палкоўнік**. Можаце не хаваць, чаму так лёгка здаяцеся? Я ж не такі глыбокі старэча, каб мне ва ўсім патураць, а, пані Ганна? Цудоўны дзень для кастрычніка. Бабіна лета.

**Анка**. Зразумела… не дамаўляліся.

**Палкоўнік.** Я ж вопытны афіцэр разведкі. Хочаце, каб я кіраваў гутаркай? Нельга так лёгка здавацца. Вядома ж, можаце запісваць. А мне дык што? Урэшце рэшт, у вас у сумцы напэўна ёсць другі магнітафон, які добра запісвае голас, у ботах трэці, у валасах чацвёрты. Вы, журналісты, цяпер такія спрытнюгі, што нам у разведцы і не снілася. Не хвалюйцеся, я не буду вас абшукваць. Хто вам пра мяне расказаў?

**Анка.** Я ж вам ужо казала. Кшыштаф Янкоўскі.

**Палкоўнік.** Янкоўскі? Кшыштаф Янкоўскі. Янкоўскі, праўда? А вы ведаеце, што ён напалову вар'ят?

**Анка.** Па-мойму, ён выдатны рэпарцёр.

**Палкоўнік.** Во-ось, ужо лепей, вы ўжо мне не патураеце. Добра, добра, разлічваю на сяброўскую гутарку. Ці ведаеце вы, што Янкоўскі верыць у тэорыю змовы?

**Анка.** Глупства ўсё гэта. Прабачце. Тэорыі змовы не існуе. Гэта даўно ўжо пусты прапагандысцкі эпітэт. Пастарайцеся трохі. Вы ж, як-ніяк, заслужаны разведчык. Я разлічваю на вашу сур'ёзнасць. *(Налівае сабе малака ў кубачак, перамешвае лыжачкай)*

**Палкоўнік.** Ну-ну, дачушка…

**Анка.** Тут ужо таксама прабачце. Дачка, дачушка… Я "дзяўчынку маю" не пераношу.

**Палкоўнік.** А вы ведалі, што Янкоўскі быў сталіністам?

**Анка.** Якое гэта мае значэнне. Мы збіраліся гаварыць пра палкоўніка, пра яго ўцёкі з краіны, пра яго работу на амерыканцаў. Янкоўскі сказаў, што вы яго ведалі, працавалі з ім… Ці, дакладней, над ім.

**Палкоўнік.** Выракся сваёй сям'і. У гэтых буржуяў перад вайной у Познані было тры магазіны. А як утапіў свайго бацьку капіталіста, дык яго і прынялі ў Звяз моладзі польскай. А ў ЗМП не мог ушчаміцца, таму што ні ў армію, ні ў працоўны лагер не хацеў. Хацеў вучыцца. Быў нават за віцэ-старшыню ЗМП… на факультэце.

**Анка.** Вельмі прыемна, што вы пра гэта ўспомнілі.

**Палкоўнік.** Людзей забіваў, даносы пісаў на беспартыйных прафесараў, даводзіў іх да суда калегіі. Шмат людзей праз яго скончылі жыццё ў ссылцы, у лагерах, у арміі.

**Анка**. Ён вас вельмі… цэніць. Гаворыць пра вас паважліва.

**Палкоўнік**. Паважліва? Пра мяне? Бач ты, як залгаўся, свалата. У ахвоту выкрываў класавых ворагаў, людзей з чужым паходжаньнем, загадваў ім шматразова перапісваць біяграфіі, а потым сам жа іх "правіў".

**Анка**. Але ж быў усяго толькі студэнт.

**Палкоўнік**. Цынічны сталінскі прыхвасцень. Ён жа, ці ведаеце, мой аднагодак. Усе былі дужа маладыя, каб здыхаць у лесе, але страшэнна старыя, каб верыць у Зютка Сонейка.

**Анка**. Мы пра палкоўніка збіраліся размаўляць, пра яго ролю ў зломе сцяны, у завяршэнні халоднай вайны…

**Палкоўнік**. Адзін не дзейнічаў, заўсёды ў калектыве. Вы ведаеце, што такое калектыў? Банда ідыётаў са Звяза моладзі, падмацаваная парай лахудраў з ПАРП. Актыў. Калі нехта ім не падабаўся, наладжвалі яму цёмную. Пастаяннае заслухоўванне , дазнанні. Некалькі прышчаватых дурнілаў з чырвонымі гальштукамі на шыях публічна здзекаваліся над сваім таварышам ці вучоным. Над сваім настаўнікам. Дастаткова было проста хадзіць у касцёл. Або, калі дзяўчына проста не хацела даць такому актывісту. Агідна было ім даваць, хаця б таму, што ад іх смярдзела, патыхала ці не за кіламетр. Неахайныя былі. Пазногці такія… як чорны шрыфт.

**Анка**. Навошта вы мне гэта расказваеце? Вы ж самі ўсё жыццё слугавалі камуністам. А Янкоўскі, нават калі і рабіў памылкі, то потым слаўна за іх расплаціўся.

**Палкоўнік**. Расплаціўся? Калі гэта?

**Анка**. Быў інтэрніраваны ў часы ваеннага становішча. Вы апошні чалавек, які мае права яго асуджаць.

**Палкоўнік**. Герэка таксама інтэрніравалі. Шыдлак, Врашчык, Пыка. Хто ім гэтыя прозвішчы навыдумляў? Або – Грудзень. Грудзень памёр у інтэрнацe. Ён таксама герой? Смачная кава?

**Анка**. Так, а што?

**Палкоўнік**. Вы горкую п'яце. Я бы горкую ні за што, ні за якую ўзнагароду.

**Анка**. А я вось п’ю.

**Палкоўнік**. Я неяк палічыў – напісаў тады больш за трыццаць сваіх біяграфій. Усе розныя. І ні разу не памыліўся. Прынясу вам парачку. Вы ж павінны ведаць, з кім размаўляеце.

**Анка**. Але я ведаю, з кім размаўляю. Ведаю, хто вы. І кім вы былі.

**Палкоўнік**. А вось і не, якраз вось гэтага вы не ведаеце.

*Устае, выходзіць з пакоя. Калі за ім зачыніліся дзверы, Анка дастае з сумкі папяровую сурвэтку, выцірае ёю губы, хавае. Азіраецца, бярэ кубачак, падыходзіць да пальмы ў вялікай кадзі. Чуваць, як адмыкаецца замок на дзвярах у другі пакой, дзверы прыадчыняюцца. Анка вылівае каву ў кадзь з пальмай. З-за прыадчыненых дзвярэй чуецца гырканне сабакі. Анка паварочваецца, дзверы зачыняюцца, чуваць, як паварочваецца ў замку ключ. Анка ставіць кубачак, з рэшткамі гушчы, на стол, падыходзіць да дзвярэй, адхіляецца, каб яе не было відаць у вочка, чуе за спінай крокі Палкоўніка, паварочваецца.*

**Анка**. Харошая ў вас калекцыя талерак. Ручная работа?

**Палкоўнік**. Кажуць, ручная. Влацлавек. Калісьці больш было. Усе з глузду з’ехалі праз Влацлафка. Мода прайшла, фабрыка падупала, людзей выгналі на вуліцу.

*Падае ёй два дакументы. Садзяцца.*

**Палкоўнік**. Яшчэ кавы?

**Анка**. Не, дзякуй.

**Палкоўнік**. А то вы так хутка выпілі. Чытайце, чытайце. Можа, што-небудзь… з градусамі?

**Анка**. Я на машыне, я ж сказала.

**Палкоўнік**. Услых чытайце, асабліва тую, старую. Проста шэдэўр.

**Анка**. Нарадзіўся на Замойшчыне 11 снежня 1934 года ў сям’і беспрацоўнага наёмнага сельгасрабочага і рамесніцы. Гэта няпраўда?

**Палкоўнік**. Дата народзінаў недакладная, а ўсё астатняе зусім нават можа быць. Цяпер ужо ніхто гэтага не ведае. Усё астатняе – самая чыстая праўда. Бацька быў аканомам маёнтка, маці – гувернанткай. У снежні ўсе сельгасрабочыя беспрацоўныя. Вось сюды паглядзіце, калі ласка…

*Падае ёй другую біяграфію, на выгляд больш новую.*

**Анка**. “У лютым 1951 года прыведзены да прысягі як член падпольнай арганізацыі “Арол і Меч”, і разам з таварышамі ўзяўся выконваць заданні па сабатажу і распаўсюджванні антыкамуністычнай прапаганды”. У 51-ым было нейкае падполле?

**Палкоўнік**. У Польшчы заўсёды ёсць нейкае падполле… апошнія гадоў дзвесце, як мінімум. А тады ў кожнай прыстойнай школе ці парафіі з’яўляліся якія-небудзь групы супраціўлення. Мянушкі, прысягі, канспірацыя, самвыдат, надпісы на сценах… Партрэты зрывалі – Сталіна,

Берута, Ракасоўскага. Нам пашанцавала, трапілі да людзей, якія тлумачылі, што рабіць. А можа, гэта было якраз нешанцаванне…

**Анка**. І чым вы займаліся?

**Палкоўнік**. Сабатаж, прапаганда, рускіх “пасвілі” – іх тады ў Варшаве было поўна. Потым па “Радыё Лондан” перадавалі, напрыклад, што з актрысай імярэк забаўляецца генерал, таксама імярэк, які выконвае абавязкі паляка. Ці дзе швэндаецца пасол Лебядзеў. Ці… хто з іх любіць пазабаўляцца з хлопчыкамі з ансамбля песні і танца. У выніку нехта нават раскапаў інфармацыю аб тым, хто ў Ракасоўскага палюбоўніца. У Ракасоўскага, так званага маршала Польшчы. Смеху было…

**Анка**. І хто яна?

**Палкоўнік**. Супакойцеся, яна яшчэ жывая. У яе дзеці. Таксама жывыя. Адных толькі пазашлюбных дзяцей Берута ў Польшчы і сёння жыве больш за дзесяць. На радыё дыктарак галілі.

**Анка**. Гэта як?

**Палкоўнік**. Машынкай, дагала, як звычайна. Апраналіся прыстойна, кветкі куплялі, нібыта мы кур’еры з магазіна кветак, і ўсё. Дагала астрыгчы – гэта ж раз-раз і… гатовенькая… Адзін трымае, другі стрыжэ, трэці чытае прысуд. Імем Польскай Рэспублікі…

**Анка**. Але навошта?

**Палкоўнік**. А навошта па ўсёй акупіраванай Еўропе астрыгалі жанчын, якія немцам давалі?

**Анка**. Яны былі здрадніцамі, праявілі нелаяльнасць у адносінах да сваёй дзяржавы і народа.

**Палкоўнік**. Вось іменна. Мы таксама абаранялі дзяржаву. А аднаго разу – цудоўны вераснеўскі дзень – нават застрэлілі Мартыку. Вы, вядома ж, не ведаеце, хто гэта быў? Стэфан Мартыка?

**Анка**. Ведаю, дыктар на радыё – хваля 49. Ці нешта падобнае.

**Палкоўнік**. Выдатны кадр. Немагчыма было радыё спакойна паслухаць, бо кожную хвіліну ўключалася яго брахалаўка: “Прывітанне, вітаю ўсіх, з вамі хваля-49”. Усіх паважных людзей абылгаў. На Касцёл паклёпнічаў, на падполле. Вядома, былі і горшыя, не ён адзін, але папаўся пад руку менавіта ён. Пасля гэтага забойства яны там усе ашалелі, хапалі ўсіх… без разбору. Пачаліся рэпрэсіі: на працэсе было вынесена пяць смяротных прысудаў. Гэтых – пяць студэнтаў – забілі, астатніх пасадзілі надаўга: нехта звар’яцеў, нехта скончыў самагубствам. Паршыва, праўда?

**Анка**. Сталінскія часы… Перыяд памылак, пралікаў і прамашак.

**Палкоўнік**. Што? Гэтае азначэнне яшчэ ў вялікім ходу? Пралікі і прамашкі? Гэта ідыятызм, называць забойства людзей “пралікамі-памылкамі і прамашкамі”. Можа, усё ж такі вып’еце чаго-небудзь?

**Анка**. Я вас прашу, не турбуйцеся. Проста я не п’ю. Але я зусім не… калі вы хочаце выпіць, пан палкоўнік…

**Палкоўнік**. Ды не ўжо, прабачце, таксама не буду. Праверaная журналісцкая хітрасць – думаеце, паддасць стары і болей вам раскажа? Вы гэта… што… за камуняку мяне “трымаеце”, які праўду толькі з п’яных вачэй можа сказаць?

**Анка**. Ну што вы, пан палкоўнік…

**Палкоўнік**. Я вам і так усё раскажу і… без гарэлкі. На жаль. Прыняў такое рашэнне.

**Анка**. Тады раскажыце, калі ласка, калі вы ўпершыню сустрэліся з палкоўнікам. Як вы пазнаёміліся?

**Палкоўнік**. Паколькі гарэлку вы не п’яце, то можа, яшчэ кавы? Піроўнае не купіў… прабачце старому… Заводскія не ем… незразумела, што яны ў іх кладуць. Не чулі пра начынку з пацучынай шэрсці?

**Анка**. Нельга верыць усяму, што чуеш.

**Палкоўнік**. Можа і нельга. А ў кандытарскай рамонт – падцягваюць да еўрапейскай нормы. Асобна зліў для яек, асобна для начынкі, асобна мужчынскі гардэроб, жаночы, левыя чаравікі сюды, правыя туды…

**Анка**. Не, я не хачу ні гарэлкі, ні кавы, ні піроўнае, ні цукру. Я хачу, каб вы пачалі гаварыць.

**Палкоўнік**. Дык я ж і кажу, пасля забойства таго клоуна гэтыя дурыкі са спецслужбаў ашалелі, не, з глузду з’ехалі: арыштоўвалі ўсіх без разбору, усіх, хто пад руку трапіць. У выніку, напярэдадні Калядаў 1952 года павязалі мяне і маю групу, нас разам адправілі ў Пастэрку. Сярод нас быў здраднік.

**Анка**. Хто?

**Палкоўнік**. Не мае значэння. Ён жывы, і жыве, трэба сказаць, нядрэнна. Таксама аўтарытэт. У сваёй галіне. У пэўнай ступені. Калісьці быў для мяне блізкім чалавекам… гэта, напэўна, называецца сябар… Неяк вось так можна сказаць…

**Анка**. Вы з ім сустракаліся потым? Пасля таго, як выйшлі з турмы? Ну, можа, у трамваі, мо на вуліцы?

**Палкоўнік**. Не, ніколі. Білі мяне да Трох Каралёў. Гэта значыць, да 6 студзеня 1953 года. Канвеер там: карцэр, на табурэт саджалі, ставілі па шчыкалаткі ў гаўно, пяткі, пальцы, ныркі і… па кругу… У вочы плявалі, валасы вырывалі… Што там яшчэ… пробныя расстрэлы… Гэта ўсё вам вядома. Пра гэта і ў кнігах пісалі , і ў газетах, нават фільм знялі. Гэта справы яўныя. Не буду вас мучыць.

**Анка**. Так, і чытала, і чула. А што здарылася пасля Трох Каралёў?

**Палкоўнік**. Я ўжо страціў адчуванне зменаў часу, я не ведаў: ён ідзе, бяжыць ці ляціць, бо яны мардавалі яшчэ горш. Стойка, павырывалі пазногці, пяткі былі парэзаны да касцей. Спаць прымушалі пры адчыненым акне. Голад, вошы, смурод, пераломы, раны кроватачылі. Ды вы ж самі ўсё гэта ведаеце. А то я вам ужо, мабыць, надакучыў.

**Анка**. Вы мне не надакучылі.

**Палкоўнік**. Прызнаўся я ў канцы студзеня. А можа, гэта быў ужо пачатак лютага. Пазней, праз два месяцы, ужо… пісаў даносы. Ды якія прыгожыя, вычарпальныя, атрымалася б ніштаватая аповесць, а мо і дзве. Праўда героі – усе адмоўныя. Рэалістычная, праўдзівая аповесць… Шмат людзей здаў…

**Анка**. Сяброў, знаёмых?

**Палкоўнік**. Сябры на той час ужо сядзелі. Павялічваць тэрмін? Які сэнс? Незнаёмых здаваў. Так прасцей было. Гэтыя потым хоць не сніліся. У незнаёмых няма твару. У такой сітуацыі – гэта вялікі плюс.

**Анка**. Напрыклад?

**Палкоўнік**. Пыталіся ў мяне пра ксяндза з Кельцаў. Я сказаў, што ён на споведзі падгаворваў мяне забіць сакратара партыі ў Астраўцы і… яго сям'ю.

**Анка**. Пачакайце, пры чым тут Кельцы?

**Палкоўнік.** Там выкрылі шпіёнскую групоўку. Гэта была сумесная ватыканска-лонданская сетка у курыі епіскапаў. А ў Кельцах я ніколі не быў, на споведзь хадзіў аднойчы, перад першым прычасцем. Мне за гэта павінны былі заплаціць трыста даляраў, сто адразу, астатнія - пасля. Даляр упершыню ўбачыў у шасцідзесятыя гады, на вучэннях. Прызнаўся ва ўсім. Мне было гадоў васемнаццаць ці дзевятнаццаць, а можа семнаццаць. У лютым мне вынеслі смяротны прысуд. Адбывалася ўсё ў камеры. Камерны працэс. Ведаеце што гэта такое?

**Анка.** Так чула, прысуджанага саджаюць на парашу.

**Палкоўнік.** У маім выпадку гэта было вядро. Магчыма у якой-небудзь іншай камеры была параша, але я сядзеў на вядры. Прысуд быў выкананы 7 сакавіка. Чалавек у польскім ваенным мундзіры застрэліў мяне ў піўной на Кошыковай. Калі добрае надвор'е, з балкона гэтае месца відаць. Гэта было 7 сакавіка 1953 года. Ён яшчэ жывы гэты чалавек. Праз шмат гадоў мы з ім гарэлку пілі вёдрамі. На сустрэчах у саюзе воінаў. За свабоду і дэмакратыю! Значыць, мы з ім за адно і тое ж змагаліся. Ён быу бандыт. Злачынец. У часы акупацыі, яшчэ нямецкай, шантажыраваў яўрэяў.

**Анка.** Шэльма?

**Палкоўнік.** Краў, забіваў... Калі прыйшлі Саветы, ушчаміўся ў органы. Толькі праз некалькі месяцаў я даведаўся, што за 2 дні да майго прызнання памёр Сталін, самы жудасны монстр у гісторыі чалавецтва.

**Анка.** А Гітлер?

**Палкоўнік.** Гітлер? Без шансаў. Гэты хоць быў прыгажэйшы і фотагенічны.

**Анка.** Дзіўны ў вас густ. Вас памілавалі? Я чула, што пасля смерці Сталіна некаторыя смяротныя кары былі адменены.

**Палкоўнік.** Не памілавалі. Застрэлілі. Пасля ўжо, ноччу, разам з адным таварышам з маёй групы, палкоўнікам з "працэса генералаў" і двума салдатамі з Народных Узброеных Сіл, мяне вывезлі на Служаў. Кінулі ў магілу. Можа, машыны зараз нада мной ездзяць, а можа, коні скачуць... Калі-нікалі думаю пра гэта. І дзе гэта я ляжу? А можа, пашэнціла - закапалі дзе-небудзь пад музычнай школай.

**Анка.** Як гэта?

**Палкоўнік.** Калісьці там было поле, а потым пабудавалі дамы, ну, і школу музычную. Увесь дзень з таварышамі слухаем, як дзеці спяваюць. Як гамы іграюць. "Пане Яне, пане Яне, устаць пара, устаць пара. Б'юць званочкі, б’юць званочкі, дзінг, данг, донг..."

*Тэлефонны званок. Палкоўнік падыходзіць да апарата, здымае трубку.*

Каладзей, слухаю…Дабрыдзень. Так, калі ласка.

*Кладзе трубку на столік. Падыходзіць да дзвярэй у другі пакой, стукае два разы, вяртаецца, падносіць трубку да вуха, трымаючы яе трохі на адлегласці, потым кладзе на апарат.*

Дзінг, данг, донг.

**Анка.** Дык вас завербавалі? Перайшлі на другі бок?

**Палкоўнік.** Тады я знік, па-сапраўднаму. Баязлівец – гэта герой, якому Трошкі не пашанцавала. Як і многія іншыя, я зразумеў, што дзякуючы стараннасці Саветаў, я не маю ніякага значэння. Камуністам усе роўна, памру я ці застануся жывы. Яны маніпуліравалі мільёнамі чалавечых жыццяў. Што ім нейкі адзін паляк…У іх жа былі планы забойстваў: квартальныя, гадавыя, пяцігадовыя. Таму адзін чалавек – гэта прышч.  У адрозненні ад іх, для мяне маё жыццё мела значэнне. Велізарнае значэнне. Якраз такое ж, як і ваша жыццё - для вас.

**Анка.** Вас завербавалі ў камеры смяротнікаў?

**Палкоўнік.** Так. Афіцэр быў даволі мілы чалавек. Гаварыў без акцэнта. Ну, амаль без акцэнта. Адчувалася, што доўга працаваў у Польшчы. Не памякчаў гукі, гаварыў “нармальне”, а не “нармальна”. Практычна паляк, трохі толькі беларус. Толькі адзін раз сказаў “пакуль што”. Гэта, ведаеце, рускі выраз… “Пакуль што пакінем вас сярод жывых. Малодшы лейтэнант Каладзей, пакуль што…”

**Анка.** Малодшы лейтэнант? Чаму?

**Палкоўнік.** Тады я яшчэ не ведаў.

**Анка.** Вы перайшлі на другі бок? Чаму?

**Палкоўнік.** Чаму? Вы не разумееце? Выдаткуеце столькі грошай на касметыку, напэўна ходзіце ў спартзалу, да ўрачоў, не курыце, кінулі піць. Вы ж гэта не дзеля Радзімы робіце, і не дзеля справядлівасці, і нават не дзеля Бога. Для сябе вы гэта робіце. Каб як мага далей захаваць маладосць, здароўе, прыгажосць. Ваша жыццё таксама мае для вас каштоўнасць. Невымерную.

**Анка.** Я ў вас не пыталася, чаму вы так зрабілі. Я пыталася, уласна, чаму вам адрасавалася прапанова? Бо не кожнаму ж давалі такі шанс.

**Палкоўнік.** Пасля смерці Сталіна, тайныя агенты адны з першых зразумелі, што надышоў час трохі аслабіць шчамлёткі. Можа, адчувалі, што далей знішчаць народ старымі метадамі ўжо немагчыма. Што жывы можа быць больш карысны, чым мёртвы. А ўвогуле я не ведаю, вы лепш ў іх спытайце.

**Анка.** Я пытаюся ў вас – вы ж адзін з іх. Чаму яны выбралі вас?

**Палкоўнік.** Не ведаю. Можа ўбачылі, не, адчулі ўва мне слабіну. Наіўнасць некую.

**Анка.** Наіўных у разведку не бяруць.

**Палкоўнік.** Ён сказаў – гэты, без акцэнта – што ён паляк, як і я, і што хоча выратаваць мяне і іншых дастойных людзей, дзеля будучыні. Дзеля Польшчы. Даў зразумець, што не заўсёды будзе так, як ёсць.

**Анка.** Даволі збітая фраза.

**Палкоўнік.** Дык гэта ж было паўстагоддзя назад. Тады ўсё было новым – тэрор, правакацыі, шантаж. Пазней мяне яшчэ адзін "апрацоўваў", той увогуле нагадваў даваеннага інтэлігента. Маўляў, лепшыя загінулі, маўляў, трэба ратаваць, што засталося ад генафонду, каб гісторыя не закончылася. Што маё служэнне Польшчы яшчэ не скончылася, а толькі пераходзіць, набывае іншую форму.

**Анка.** І вы ім паверылі?

*Дзынкнуў тэлефон, размова ў другім пакоі закончылася. Палкоўнік падыходзіць да апарата, здымае трубку – доўгі гудок, кладзе трубку назад.*

**Палкоўнік.** Увосень 1953 года я паступіў у вышэйшую школу пяхоты. Тады ж пачаў працаваць на службу ваеннай інфармацыі, у контрразведцы. Неафіцыйна. Разумееце пра што я?

**Анка.** Разумею.

**Палкоўнік.** Не, не разумееце. Я стаў малодшым лейтэнантам у афіцэрскай школе. І адначасова – прафесійным стукачом, якому належыла сачыць за сваімі сябрамі. За людзьмі, з якімі я спаў і еў у адным доме.

**Анка.** Але гэта была польская разведка, польская армія?

**Палкоўнік.** Вядома ж. У Польскай Рэспубліцы толькі пельмені былі рускія. Былі. А ўсё астатняе – польскае. На Чэхаславакію напалі, абараняючы інтарэсы польскага народа. Зразумела. І ў рабочых стралялі таксама ў імя рабочых. За забойствам людзей заўсёды стаяла партыя, якая і польская, і рабочая. НСДАП таксама была нямецкая і рабочая. Нацыянал-Сацыялістычная Рабочая Партыя Германіі. НСДАП толькі хіба аб'яднанай не была.

**Анка.** Я на вашым месцы не параўноўвала б ПАРП з гітлераўскай партыяй. Камуністы не знішчалі паў-Еўропы і не пачыналі сусветныя войны.

**Палкоўнік.** Сур'ёзна? А хто напаў на Польшчу ў верасні 1939-га? Толькі немцы ці нехта ім дапамог? А на Фінляндыю? Хто разграміў два кантыненты – ад Польшчы да В'етнама і Карэі?

**Анка.** У ПАПП было шмат прыстойных людзей.

**Палкоўнік.** У НСДАП вы б таксама адшукалі безліч канфармістаў. Тых, каму хацелася нацызму з чалавечым тварам. Яны былі, напрыклад, супраць забойстваў псіхічна нездаровых немцаў. Некаторыя, зразумела.

**Анка.** Вы самі былі ў камуністах.

**Палкоўнік**. Вось вам і цудоўны прыклад прыстойнага чалавека. Тайны афіцэр ваеннай інфармацыі. Агент, даносчык, калі-нікалі правакатар. У-ух, ведалі б вы, што я вырабляў у 67-м, у 68-м, у 70-м. Можа яшчэ кавы?

**Анка.** Не, дзякуй. Вернемся ў школу пяхоты. Вы там пазнаёміліся з палкоўнікам? Там упершыню сустрэліся?

**Палкоўнік.** Палкоўнік… Ён тады яшчэ і паручнікам, мабыць, не быў. Можа, пару разоў і бачыў яго. Але я не пра гэта збіраўся…

**Анка.** А я хацела якраз пра гэта. Пра яго ролю ў гісторыі. І пра тое, што ў Польшчы ён да гэтага часу з’яўляецца фігурай супярэчлівай. Мы пра такі фармат размовы дамаўляліся – вы, пан палкоўнік, і я.

**Палкоўнік.** Дамаўляліся? Вы ўсё яшчэ верыце мужчынам?.. У вашым узросце?

**Анка.** У мяне няма часу...на жарты. Асабліва на старыя.

**Палкоўнік.** Ніколі б не адважыўся з вамі … жартаваць. Вы – сур’ёзны чалавек. Сур’ёзны журналіст. Вас жа яўна не толькі таму палкоўнік цікавіць, каб атрымаць стыпендыю ў Амерыцы, а пры выпадку выдаць бестселер. Можа, не такі папулярны, як кулінарныя кнігі, але… Вы – сур’ёзны чалавек, і сур’ёзна ставіцеся да мірнага існавання людзей, дарэчы, як і я … таму я хачу, каб вы мяне выслухалі.

**Анка.** Я вас слухаю, пан палкоўнік, але не магу ўцяміць, куды вы хіліце размову. Мы збіраліся гаварыць пра іншага чалавека, не пра вас.

**Палкоўнік.** Хаця выехаць вам не зашкодзіла б. Лішнія грошы таксама, гэта зразумела, але найпершае – выехаць. Усякаму разумнаму чалавеку неабходна час ад часу вырывацца адсюль, з Польшчы. Гэта я вам кажу. Адчуць адлегласць, адпачыць, падыхаць іншым паветрам. Трэба падумаць пра якую-небудзь добрую стыпендыю. Можа Фулбрайт ці Фонд Касцюшкі. Трэба падумаць.

**Анка.** Я нікуды не збіраюся.

**Палкоўнік.** Вас з дзяцінства бацькі выпраўлялі на разнастайныя курсы англійскай мовы. Ёсць розныя самавіта-значныя журналісцкія гранты, рэгулярныя сустрэчы з палітыкамі, практыка на CNN ці ў вялікай газеце. Вялікія сутачныя. Не якое-небудзь дзярмо для пісак. Нармальныя гасцініцы, а не прытоны для студэнтаў з краін трэцяга і чацвёртага свету. Выдалі б кнігу журналісцкіх расследаванняў – Кісінджэр, Буш – старэйшы, Тэд Кенедзі, Падгорац, Джымі Картэр, Бярозка, зразумела. Вам бы гэтага хапіла на ўсё ваша жыццё. Тут.

**Анка.** Вы спрабуеце давесці, што можаце арганізаваць мне стыпендыю ў Штатах? Вы, адстаўны афіцэр народнай арміі?

**Палкоўнік.** Мгу-у. Ох, хуткаплынная вадзічка… Іменна гэта я і спрабую вам утлумачыць. Вы здіўлены? Вы сапраўды не верыце, што тайныя службы могуць дапамагчы ў гэтай справе? Колькі вам гадоў?

**Анка.** Мы жывём у свабоднай краіне…

**Палкоўнік.** Безумоўна. Але паклапаціцца пра некага яшчэ можна. Кагосьці падштурхнуць, кагосьці адштурхнуць. Вы не верыце, што ў мяне ёсць такія магчымасці?

**Анка.** Не мае значэння, у што я веру, у што не веру.

**Палкоўнік.** Якраз гэта і мае значэнне. Не для вас, а для вашых чытачоў. Тое, якім вы бачыце свет, мае значэнне для многіх людзей. Вы іх вочы і вушы. Калі б не Франц Кафка, многія з нас і не адчулі трагізму і бяссэнсавасці быцця.

**Анка.** Выходзіць, вы і літаратурны тэарэтык? Можа, яшчэ і вялікі мовазнавец?

**Палкоўнік.** Брава! Вы, значыць, маеце ўяўленне аб гісторыі. Можа, усё ж такі, хочаце даведацца, хто я такі? Як пражыў сваё жыццё, чым займаўся?

**Анка.** Прашу прабачэння, у вас, відаць, назапашана шмат забаўных баек. Але, перш за ўсё, мяне цікавіць палкоўнік.

**Палкоўнік.** Ён палкоўнік, я палкоўнік. Ён служыў, і я служыў. Хіба не ўсё роўна?

**Анка.** Мне здаецца, што не.

**Палкоўнік.** Я ж пажартаваў. Расчароўваеце вы мяне, пані Ганна. Вас, журналістаў, вучаць таму ж самаму, што і нас – дай выгаварыцца.

**Анка.** Мяне ніхто не вучыў журналістыцы. Прынамсі, такой.

**Палкоўнік.** Можа, гэта і добра. Дык вось, у 53-м годзе, ратуючы сваю шкуру, я парушыў тайную прысягу, здрадзіў сябрам і Радзіме. Пачаў працаваць на карысць замежнага засілля і чалавеказнішчальнай сістэмы. Вам не сумна?

**Анка.** Вы куды скіроўваеце?

**Палкоўнік.** Гэта было ўвесну 53-га… Ужо пасля карэйскай вайны, пасля разні і галадамору мільёнаў украінцаў. Пасля вывазу і знішчэння салдат Арміі Краёвай. Вядома ж, я ведаў, хто страляў у Катыні. Усе ведалі. У Саветаў ужо была ядзерная зброя. Ужо некалькі месяцаў, як я стаў паўналетнікам, і не мог заставацца ў баку – Саветы збіраліся знішчыць мой народ, а ў глабальным плане – падабраць пад сабе ўвесь свет. Яны нават не ўтойвалі гэта – крычалі пра сусветную рэвалюцыю, вызваленне рабочай масы. Пад словам “рэвалюцыя” мелася на ўвазе ліквідацыя класавага грамадства і народаў, а гэта генацыд. Вызваленне рабочых мас, гэта – на іх мове – усеагульная рабская праца. Вы чулі пра Камбоджу? Пра архіпелаг ГУЛАГ?

**Анка.** Вы куды скіроўваеце?

**Палкоўнік.** Колькі на гэтай касеце? Перавярнуць не трэба?

**Анка.** Там аўтарэверс – яна сама перавернецца.

**Палкоўнік.** Гэта добра. Вы пакуль што не здагадваецеся, мне здаецца.

**Анка.** Гэта шпіёнам можна здагадвацца, а журналіст павінен ведаць. Чаго вы хочаце?

**Палкоўнік.** Хачу новы Нюрнберг. Вось і ўсё. Не хачу вас абражаць, пытаючыся, ці ведаеце вы, што гэта такое.

**Анка.** Хочаце Нюрнберга для камуністаў? Гэта ўсё? І як вы збіраецеся гэта праўдзіць?

**Палкоўнік.** Нюрнберг для камуністаў… А што, гучыць нядрэнна. Але ў маім узросце не варта ставіць такія высокія мэты. Ды і ўвогуле, я ж не супраць камуністаў.

**Анка.** Чаго вы хочаце, палкоўнік?

**Палкоўнік.** Хачу Нюрнберга для сабе. Хачу, каб мяне судзілі.

**Анка.** Вы?

**Палкоўнік.** Так, я. Я ўжо сказаў – я здрадзіў Радзіме. Прымаў ўдзел у акцыях рэпрэсіўнага механізма здрадніцкай сістэмы. Забіваў людзей. Не толькі ў пяцідзесятыя гады. Я хачу, каб мяне судзілі. У мяне ж ёсць на гэта права?

**Анка.** Мусіць, ёсць. Вы мне ўсё гэта расказваеце, я гэта публікую, і выстаўляю на суд грамадскай думкі. Вы так сабе гэта ўяўляеце?

**Палкоўнік.** Шкада… Вы не зразумелі мяне. Гаворка не пра нейкае маральнае ці палітычнае асуджэнне. Я хачу… звычайны суд. Па справе аб злачынстве супраць чалавецтва. З пракурорам, суддзёй і адвакатам. Суд з… прысудам у імя Рэспублікі. Звычайны суд. Перад якім стаяць забойцы і гвалтаўнікі. У мяне, як і ў іх, ёсць права на справядлівы суд. Адзінае, чаго ў мяне няма… хтосьці ж павінен напісаць… заявіць пра злачынства. Гэта будзеце вы, пані Ганна. Іменна вы.

**Анка.** Я? Чаму я?

**Палкоўнік.** А чаму не вы?

**Анка.** Мы дарэмна трацім час. Я не буду ні на каго пісаць даносы. Не даносіла, не даношу і даносіць не буду.

**Палкоўнік.** Гаворка не пра данос. На мяне даносіць не трэба. Хопіць і заявы аб злачынстве.

**Анка.** Гэта тое самае.

**Палкоўнік.** Калі б вы сустрэлі на вуліцы забойцу, забойцу, якога шукае паліцыя, чалавека, якога ўчора паказвалі ў 997, няўжо вы не паведамілі б паліцыі?

**Анка.** Гэта зусім іншае. Вы не злачынец, якога шукае паліцыя.

**Палкоўнік.** Не, але павінен быць.

**Анка.** Гэта не мая справа.

*Пайшла да дзвярэй, вяртаецца за дыктафонам, Палкоўнік знерухомеў. Анка поркаецца з замкамі і засаўкамі.*

**Палкоўнік.** Гэта ваша справа.

**Анка.** Не.

**Палкоўнік.** Ваша.

**Анка.** Не.

**Палкоўнік.** Вас цікавіць, як я забіў палкоўніка Міхаіла Візнера?

*Анка адыходзіць ад дзвярэй.*

**Анка.** Вы ведалі майго бацьку?

*Палкоўнік дастае з кішэні ордэн.*

**Палкоўнік.** А як жа. Гэта я яго ўстраніў. Прыкончыў. Вось, калі ласка, ордэн саракагоддзя Польскай Народнай Рэспублікі, 1984 год. Гэта за яго. Ваш бацька загінуў у лютым? У лютым. А ордэн мне далі 22 ліпеня. Лічыце, гэта таксама толькі мая праблема?

**Анка.** Хто вы такі?

**Палкоўнік.** Палкоўнік Стэфан Каладзей – я ўжо прадстаўляўся. Я атрымаў рэкамендацыю выдаліць Міхала з арміі. Ціха, без шуму і, па сутнасці, без працэса. Ну, я і выдаліў. У нейкім сэнсе.

**Анка.** Рэкамендацыю? У арміі гэта называецца загад, наколькі я ведаю. Хто загадаў?

**Палкоўнік.** Ніхто. Гэта лунала ў паветры, фразы-намёкі, алюзіі: "Што гэта ён там робіць да гэтай пары?" Бязвінныя пытанні перастаюць быць бязвіннымі, калі іх задае генерал. Ці савецкі палкоўнік. Добры аванс, ніякіх подпісаў.

**Анка.** Хто загадаў вам знішчыць майго бацьку?

**Палкоўнік.** Не было ніякага загаду. Вы ж ведаеце, што яго… ну, ніяк быць не магло. Атмасфера такая была…

**Анка.** Загаду не было?

**Палкоўнік.** Не.

**Анка.** Значыць, гэта вы самі вырашылі, і ніхто іншы?

**Палкоўнік.** Я. Вядома ж, я. Цяпер вы напішаце заяву аб злачынстве? Хочаце ведаць, што ў вашым жыцці адбывалася сапраўды, а што разыграна па сцэнарыях спецслужбаў?

**Анка.** Добра, я дастаю дыктафон. Раскажыце пра майго бацьку. І закончым.

**Палкоўнік.** Не, не трэба даставаць. Ці я расказваю ўсё, ці нічога. Не вы дыктуеце ўмовы, пані Ганна. Бывайце. Вяртайцеся, калі надумаеце. Я не жартую. Сапраўды, я яго забіў. Да сустрэчы.

**Анка.** Але я павінна ведаць…

**Палкоўнік.** Я сказаў ясна – ўсё ці нічога. Мы дамовіліся…

### Сцэна 2

*Анка і Палкоўнік адыходзяць ад дзвярэй. Анка вешае плашч, кладзе парасон.*

**Палкоўнік.** Толькі не кажыце мне, што ідзе дождж.

**Анка.** Не казала б, але ідзе. У мяне мокрая галава?

**Палкоўнік.** Не, сядайце, калі ласка.

**Анка.** А вы так прыглядаліся.

**Палкоўнік.** Прыглядаўся? Вам падалося…

**Анка.** Прыглядаліся. Мне не падалося.

**Палкоўнік.** Вы ператварыліся ў прыгожую жанчыну. Я, у маім узросце… Вам падалося. Я не прыглядаўся.

**Анка.** Ну… хай сабе.

**Палкоўнік.** Каву? Я спецыяльна купіў апарат, каб вам… не выліваць.

**Анка.** Ніхто не выліваў… Вам падалося.

**Палкоўнік.** Вылілі-вылілі… нічога страшнага. Мо дапаможаце мне, зрабіце ласку…

*Анка і Палкоўнік падыходзяць да шафкі, Палкоўнік ключом адмыкае дзверы, дастае апарат для кавы. Яна дапамагае яму, шукае разетку, разам уключаюць кававарку і да т.п.*

**Палкоўнік.** Глынулі кілішак, каб набрацца храбрасці, ці гэта такія моцныя духі?

**Анка.** Што-о?

**Палкоўнік.** Мне падалося, што спіртным пахне. Я ж толькі спытаўся.

**Анка.** Гэта не ваша справа. Моцныя духі.

**Палкоўнік.** Я так і падумаў. Вы ўпэўнены, што гэта так робіцца?

**Анка.** Упэўнена. Паглядзіце на карцінку… вось фільтр, вось выбар опцый, двайная эспрэса, вось тут кнопачку націскаем – і гатова.

**Палкоўнік.** Вады, напэўна, трэба наліць.

**Анка.** Ну, вядома, вады.

**Палкоўнік.** Я і кажу, вады. Хопіць?

**Анка.** Ён сам спыніць. Можаце поўны наліваць.

**Палкоўнік.** Ты глянь, які разумны… Хітрун італьянскі.

*Стаяць блізка адно да другога.*

**Палкоўнік.** Можна вашу руку?

*Асцярожна бярэ далонь Анкі, разглядвае яе, як хірамант, не робячы ніякіх рэзкіх рухаў.*

**Палкоўнік.** Вы ведаеце, як вырываюць пазногці? Гэта зусім не так проста, як здаецца. Іх, напэўна, спецыяльна гэтаму вучаць.

*Анка рэзка вырывае руку.*

**Анка.** Не ведаю.

**Палкоўнік.** А я ведаю. Цікава, як можна такому вучыць?

**Анка.** Кава цудоўная.

**Палкоўнік.** Не вельмі слабая? Можна было яшчэ падсыпаць…

**Анка.** Самы раз.

**Палкоўнік.** Я рады.

**Анка.** Чаму?

**Палкоўнік.** Што вы зламаліся. Не пачалі зноў піць.

**Анка.** Адкуль вы ведаеце, што я піла?

**Палкоўнік.** 499 злотых – столькі я заплаціў за гэты аўтамат. Спецыяльна для вас купіў. Каб напаіць вас сапраўднай кавай. Я ведаў, што вы вернецеся. Ведаю, што вы выпівалі. Ведаю пра вас…

**Анка.** Усё?

**Палкоўнік.** Не, не ўсё, але столькі… колькі трэба.

**Анка.** Мы збіраліся гаварыць пра майго бацьку.

**Палкоўнік.** Гэта потым. Татачку пакінем на дэсерт. Дыктафон.

**Анка.** Прабачце?

**Палкоўнік.** Зрабіце ласку, дастаньце дыктафон.

**Анка.** Добра. *(Дастае дыктафон, ён яго ўключае)*

**Палкоўнік.** Хочаце ведаць, чаму ў вас пачаліся праблемы са спіртным? Чаму вы нікому не давяраеце? Чаму вы развяліся?

**Анка.** Піла, таму што кахала, а развод не вы мне ўчынілі.

**Палкоўнік.** Вы ўпэўнены? Ваш муж стаў карэспандэнтам прыватнага радыё ў Брусэлі. Еўропа – цудоўная мясціна. Нехта паклапаціўся пра тое, каб яго былая дзяўчына атрымала месца ў штаб-кватэры свайго банка. А ў гэтага банка, паколі ён французскі, штаб-кватэра ў Парыжы. Яе сям'я таксама якраз распалася. Парыж-Брусель, дзве гадзіны бясплатнай аўтастрадай. У іх ўжо двое дзяцей.

**Анка.** Ведаю. Гэта таксама вы арганізавалі?

**Палкоўнік.** Вы, здаецца, не шкадуеце, што гэта здарылася. Ён жахлівы чалавек, ён не заслугоўваў вас. Стажоркі, сакратаркі – здароўе ж дазваляла. Трэба было з гэтым пакончыць, інакш было б позна, ён бы сапсаваў вам лепшыя гады жыцця. Вось мы і падкінулі яму такую магчымасць.

**Анка.** Хто вы такі?

**Палкоўнік.** А ксёндз, які параіў вам пайсці на сустрэчу ў Клуб ананімных алкаголікаў? Хто яго прымусіў гэта зрабіць? Можа, Святы Дух?

**Анка.** Так, Святы Дух. Не вы ж.

**Палкоўнік.** Я. Вы былі нявера, не хадзілі ў касцёл. І раптам на вашым шляху з'яўляецца ксендз... Можа хто-небудзь паслаў яго да вас?

**Анка.** Паслаў мяне да яго...

**Палкоўнік.** Зараз успомню – Кшыштаф Янкоўскі. І не дзіва – сам алкаголік. Не п'е ужо ці не пятнаццаць гадоў.

**Анка.** Кшыштаф гэтага і не ўтойвае. Ён нават кнігу напісаў, як выйсці з запою.

**Палкоўнік.** Я чытаў усё, што ён напісаў. Не толькі тое, што пайшло ў друк. Разумееце?

**Анка.** Не.

**Палкоўнік.** Разумееце. Вы помніце, што гэта ён адправіў вас да мяне?

**Анка.** Што вы хочаце гэтым сказаць?

**Палкоўнік.** Я ўжо сказаў. Калі вы наймаліся на працу ў газету, у вас хто-небудзь патрабаваў рэкамендацыі? Помніце,хто іх вам даў? Давайце ж успомнім – выдатны польскі пісьменнік, нават ужо не рэпарцёр, інтэрніраваны ў часы ваеннага становішча, член падпольнага кіраўніцтва саюза журналістаў – ваш нефармальны апякун, папячыцель... У тэлеперадачу вас таксама прапіхнуў – "Каментарый дня " – так гэта называлася...

**Анка.** "Дзень прайшоў". Так гэта называлася.

**Палкоўнік.** Вы зрабілі сабе аблічча, прозвішча, зарабілі на машыну, правы... А на іх вы здалі, між іншым, з першага разу. Трыццаць чалавек здавалі, адна вы здалі з першага разу. Адна... адзіная. Без хабару. Помніце? Экзаменатар быў не вельмі строгі. Былы паветраны дэсантнік. Такі... на грака падобны. Іншым дзяўчатам прапаноўваў гарбату, каву, марожнае. А вам не прапаноўваў? Чаму? Вы, здаецца, нічым не горшая за іншых. Помніце?

**Анка.** Не, прабачце, гэта было вельмі даўно.

**Палкоўнік.** Экзаменатар вас нібы пабойваўся. Да таго, што заплюшчыў вочы, што вы з'явіліся пад чаркаю. На экзамен па ваджэнні. Гэта вы помніце? Пра такія рэчы звычайна забываюцца.

**Анка.** Контрразведка дапамагла мне атрымаць правы? Экзаменатар быў ваш?

**Палкоўнік.** Можа, так, а можа і не. Бачыце, як лёгка паверыць ва ўсемагутнасць спецслужбаў.

**Анка.** Я не веру.

**Палкоўнік.** Можа вы потым пахваліліся сяброўцы на рабоце, што, маўляў, такі харошы, ветлівы экзаменатар, да прыгожых дзяўчат не прыстае. Яна пайшла, а ён з ёю зусім па-іншаму... Давялося ісці з ім есці марожнае, а потым да яго... Яна вельмі расстроілася. А вам дапамог... проста так. Было такое?

**Анка.** Я не помню.

**Палкоўнік.** Ну-ну, хлусіць мы не ўмеем. У камуне вы б прапалі ў першы дзень. Хлусня – фундамент камунізму. Хлусня і нудота.

**Анка.** На мяне лёгка нагнаць нуду, вам гэта ўжо ўдалося.

**Палкоўнік.** Тая сяброўка вам ужо не сяброўка. А можа, вы пра гэта расказвалі на сустрэчы "ананімных"? Тады вы яшчэ помнілі. Магчыма, у кагосьці з нашых таксама праблемы са спіртным.

**Анка.** Подла і ганебна падслухоўваць людзей, якія спрабуюць адолець сваю смяротную хваробу.

**Палкоўнік.** Подла? Ганебна? Вы не напомніце, што азначаюць гэтыя словы?

**Анка.** Давайце без глупстваў, палкоўнік.

**Палкоўнік.** Вернемся да вашага апекуна – Янкоўскага. Кшыштаф Янкоўскі, шмат каму гэта вядома, спакойна мог абыходзіцца без жанчын. Калісьці такіх называлі "педэраст". У яго ёсць жонка і дачка, але я ўсё ведаю, і вы таксама ведаеце... Так што, думаю, як жанчына вы яму не цікавая. Да таго ж розніца ў гадах, напомню – ён мой равеснік. Дужа маладыя, каб ісці ў лес, занадта старыя, каб верыць Зютку. І не сваяк вам... Увогуле, можна падумаць, што ён вам дапамагае проста так.

**Анка.** А можа, ён дапамагае, таму што ў мяне ёсць здольнасці? Можа ён хоча выхаваць цікавую, вартую журналістку? Вы самі казалі, што цэніце мяне. Вы гэта не дапускаеце?

**Палкоўнік.** Не, пані Ганна. Давайце перастанем гуляць у гульні. Я не думаю, я ведаю, чаму ён над вамі апякуецца. Кшыштаф – я вам ужо казаў, што не паважаю яго – дапамагае вам таму, што я яго аб гэтым прашу.

**Анка.** Вы?

**Палкоўнік.** Я. Ужо шмат гадоў.

**Анка.** Навошта?

**Палкоўнік.** Наогул жа я мог бы яму загадваць. За грошы камуністаў Кшыштаф добра паездзіў – здымаў фільмы пра дзікуноў: сняданак у Пігмеяў, танцы Маарысаў, славутыя войны плямён чорнай Афрыкі на харо-ошыя грошы Савецкага Саюза. Думаеце, ён ездзіў-лятаў, таму што ведаў мовы?

**Анка.** Ваенныя карэспандэнты былі заўсёды.

**Палкоўнік.** Ён быў нашым чалавекам. А канкрэтна - маім. Таму і цяпер робіць тое, аб чым я яго прашу. Калі б не рабіў, я пачаў бы нервавацца. Навошта яму гэта? Як і ў кожнага паспяховага чалавека, у яго дастаткова ворагаў. Інфармацыю пра яго супрацоўніцтва з тайнай службай Польскай Рэспублікі з’елі б з апетытам, з асаблівым апетытам. Яго рапарты часткова тычацца і яго цяперашніх сяброў.

**Анка.** Вы яго шантажыруеце?

**Палкоўнік.** Я проста яго прашу.

**Анка.** Навошта? Навошта вы гэта робіце?

**Палкоўнік.** Я ўжо сказаў. Я забіў вашага бацьку.

**Анка.** І таму вырашылі зрабіць мне кар’еру? І нават правы?

**Палкоўнік.** Так, іменна таму. І жыллёвы крэдыт – таксама я. У вас не было пастаяннага даходу, а вы атрымалі самую нізкую працэнтную стаўку з усіх магчымых, без пасрэднікаў.

**Анка.** Гэта не Янкоўскі выдаў мне крэдыт?

**Палкоўнік.** Гэта паклапаціўся зяць аднаго нашага афіцэра – намеснік кіраўніка аддзела банка. Вы парэкамендавалі гэты банк адной знаёмай пары. Маўляў, такі прыемны супрацоўнік, заўсёды праводзіў вас аж да дзвярэй. Парэкамендавалі?

**Анка.** Так.

**Палкоўнік.** А ён іх адправіў. Хаця ў іх была нерухомасць і кватаранты. Яны ўжо таксама вам не сябры.

**Анка.** Сяброўства заканчваецца, гэта звычайная справа.

**Палкоўнік.** Не заўсёды. Нашае, напрыклад, ніколі не закончыцца.

**Анка.** Вы гэта пра што?

**Палкоўнік.** Пра сяброўства з вамі. Яно ніколі не закончыцца. Вам давядзецца, пані Ганна, з гэтым зжыцца... ваш адзіны сябар – шэльма, забойца, хто хочаце.

**Анка.** Вы мне не сябар.

**Палкоўнік.** Яшчэ які. Мы абое ведаем, што я ваш адзіны сябар. Адзіны чалавек, на якога вы можаце разлічваць.

**Анка.** Гэта няпраўда.

**Палкоўнік.** Праўда. На жаль.

**Анка.** Не.

**Палкоўнік.** Так. Помніце? Вы былі са мной ў доме адпачынку “Орлік” на Анталаўцы. Тата павінен быў прыехаць пазней. Помніце свае першыя крокі на лыжах? У вас былі лыжы “Пчолка Мая”. Вы так і не навучыліся катацца. Вы больш ніколі не ездзілі ў Закапане.

**Анка.** Няпраўда, была на Новы год, тры гады назад.

**Палкоўнік.** Значыць, мне не ўсё вядома. У пакоі быў тэлефон. Вечарам пазванілі. Папрасілі вашу маці, каб яна спусцілася да тэлефона ў кабінеце загадчыка дома адпачынку. Мамы доўга не было, з вамі забаўлялася знаёмая, жонка сябра вашага бацькі. У што вы гулялі?

**Анка.** У іх не было сваіх здяцей, яна не ведала ніякія гульні, таму мне давялося вучыць яе.

*За дзвярамі з замкамі брэша сабака, скрабе па дзвярах. Анка чуе, пазірае на Палкоўніка, ён жа працягвае говарыць і выхам не вядзе.*

**Палкоўнік.** Калі мама вярнулася, вы ўжо спалі.

**Анка.** Я прыкінулася.

**Палкоўнік.** Прыкінулася. Раніцай маці завезла вас у Лодзь, дакладней – у Сакольнік, дачны пасёлак пад Лоддзю. Да сваіх бацькоў – вашай бабулі і дзядулі. Вы там засталіся. Пахаванне было праз два дні. Маці забрала вас да сябе, хаця бабуля з дзядулем былі супраць. Вам было восем гадоў.

**Анка.** Амаль дзевяць.

**Палкоўнік.** Там я ўпершыню і ўбачыў вас. З тае пары стараюся вам, так бы мовіць, спрыяць.

**Анка.** Вы – пачвара, калі ўсё гэта праўда.

**Палкоўнік.** Праўда. Ну так... Я – пачвара. Ёсць мне месца на алеі герояў?

**Анка.** Там розныя ляжаць.

**Палкоўнік.** У ліцэі ва пазнаёміліся з хлопцам, які ўжываў наркотыкі, Марэк Маківарэк. Мы яго выдалілі з вашага акружэння. Яго бацька, на шчасце, працаваў на чыгунцы, і мы прызначылі яго дырэктарам “Варса” ў Гданьску. Але гэтага было недастаткова. Вы працягвалі да яго прыязджаць. Тады мы яго далучылі да спорту. Баскетбол у спартыўным цэнтры на Канапніцкай.

**Анка.** Я была бяздарнасцю... баскетбольнай.

**Палкоўнік.** Трэнер казаў, што вы нават двутакту не можаце навучыцца. Гэта нават я ўмею. Мы перавялі вас у “Легію” – сучаснае пяцібор’е, якое раней называлася афіцэрскім.

*Зноў брэша сабака, скрабе па дзвярах.*

**Анка.** Можа, выпусціць яго?

**Палкоўнік.** Каго выпусціць?

**Анка.** Сабаку. Там сабака замкнёны.

**Палкоўнік.** Пацерпіць.

*Б’е гадзіннік з кукушкай. Палкоўнік глядзіць на свой, наручны.*

**Палкоўнік.** Вы павінны даць мне слова гонару, што вы напішаце на мяне данос. Заяўку аб злачынстве. У аднаго з нас дваіх павінен быці гонар. Прашу вас даць слова гонару, што вы гэта зробіце.

**Анка.** Навошта гэты пафас?

**Палкоўнік.** Пафас? Нешта я стаміўся. Прабачце, сілы не разлічыў. Узрост ўжо не той.

**Анка.** Вы павінны мне сказаць.

**Палкоўнік.** Ваша праўда. Сабаку трэба выгуляць. Бачыце тую кардонку?

*Паказвае на кардонку.*

**Анка**. Што гэта?

**Палкоўнік**. Падарунак. Папкі, дакументы, запісы, фотаздымкі. Калі ласка, не саромейцеся.

*Анка падыходзіць да кардонкі, пачынае праглядаць папкі, фатаграфіі.*

**Палкоўнік**. Не-не, там няма нічога, што тычыцца вашага бацькі.

*Яна адыходзіць ад кардонкі.*

**Палкоўнік**. Хаця… Хаця, можа, штосьці-небудзь і ўшчамілася…

*Анка зноў падыходзіць да кардонкі.*

**Палкоўнік**. Не, сапраўды нічога няма.

*Анка зноў адыходзіць.*

**Палкоўнік**. Забераце ўсе гэта дадому і спакойна апішаце маё жыццё і дзейнасць. Потым, разам з доказамі, занясеце ў ваенную пракуратуру. Калі вас не будуць прапускаць, пазваніце, я вам дапамагу.

**Анка**. Не, данос…

**Палкоўнік**. Я вас прашу... Суды цяпер справядлівыя. Абвінавачваныя маюць права на абарону. Мне нішто не пагражае, апрач справядлівасці. Я больш не хачу хавацца. Вы – адзіны мой шанс. Толькі ў адносінах да вас я быў добры. Толькі вы можаце мне аддзякаваць за што-небудзь.

**Анка**. Я вас ні аб чым не прасіла. Не прасіла, каб вы нада мной апекаваліся.

**Палкоўнік**. Вы ведаеце, што такое асвенцымская хлусня?

**Анка**. Так, ведаю.

**Палкоўнік**. І што ж гэта такое?

**Анка**. Адмаўленне нацысцкіх злачынстваў. Адмаўленне існавання газавых камер, крэматорыяў. І гэтак далей.

**Палкоўнік**. І гэтак далей... Але гэта злачынства, вы ведаеце? У большасці цывілізаваных краін за гэта можна трапіць у турму.

**Анка**. І што?

**Палкоўнік**. Нічога. Вы павінны мне дапамагчы. Вы павінны мяне выратаваць.

**Анка**. Адправіўшы за краты?

**Палкоўнік**. Гэта суд меня адправіць, а не вы. Калі гэта вы зразумееце, нарэшце?

**Анка**. Я ўсё разумею, але не хачу.

**Палкоўнік**. Вы абавязаны мне дапамагчы, пані Ганна. Іменна вы. Гэта расставіць усё на свае месцы. Гэта будзе справядліва.

**Анка**. Вы ўчынілі злачынства супраць чалавецтва?

**Палкоўнік**. Нават калі не, я падпадаю пад артыкул аб злачынствах, якія па палітычных матывах не разглядаліся ў судах Польскай Народнай Рэспублікі.

**Анка**. Вы казалі аб забойствах. Колькі чалавек вы забілі?

**Палкоўнік**. Часам не колькасць мае значенне, а якасць. Думаю, пацягне на сур'ёзны прысуд.

**Анка**. Вы хочаце, каб вас засудзілі?

**Палкоўнік**. Я прашу вас, дарагая пані Ганна. Дзіцятка маё, прызнанне мяне невінаватым скампраметавала б суд. Гэта быў бы скандал.

**Анка**. Адным скандалам больш, адным менш.

**Палкоўнік**. Я хачу ў турму. Мне павінны прысудзіць якія-небудзь восем, можа, дванаццаць гадоў. Значыць, хутчэй за ўсё, да канца. Я хачу ў турму, пакуль яшчэ магу. Пакуль да мяне не пачалі зведваць літасць.

**Анка**. Не разумею.

**Палкоўнік**. Усё вы разумееце. Вы разумны і сур'ёзны чалавек. Вам патрэбна праўда. Для вас гэта важна. Вы не такая, як вашы калегі з тэлебачання. Дзеці-мімозы, у якіх малако на губах не абсохла. Іх зусім не цікавіць усё, што было да іх – нічога не разумеюць і яшчэ ганарацца гэтым.

**Анка**. Дзеці-мімозы?

**Палкоўнік**. Так, сядзяць за сваімі сталамі, як мімозы. Бяздумныя дзеці-кветкі. "Сёння пан прэзідэнт наведаў у Мшчанове двухгаловае цяля, а пан прэм'ер паглядзеў што і як у Хажове".

**Анка**. Не думаю, што ўсё так дрэнна. Ёсць і добрыя журналісты.

**Палкоўнік**. Сапраўды ж, усё заўсёды горш, чым вам здаецца. Вы разумееце, пра што я?

**Анка**. Не. Увогуле, я не разумею нашто вы ўсё гэта гаворыце.

**Палкоўнік**. Я сказаў, што хачу, каб мяне судзілі. У Бога я не веру. Калі б трапіў на Страшны суд, я, як мінімум, здзівіўся б. Я хачу, каб мяне судзілі. І не гістарычна, а ў незалежным судзе Польскай Рэспублікі – нашай радзімы. Паўтараю: я хачу паўстаць перад судом.

**Анка**. Мне здаецца, вы, палкоўнік, занадта вялікае значэнне надаяце сваёй персоне.

**Палкоўнік**. Паўтараю яшчэ раз: я здрадзіў радзіме, забіваў людзей, свядома дапамагаў Савецкаму Саюзу і спрыяў росту яго ўплыву ў Польшчы. Магчыма, былі людзі і горшыя за мяне, яны, напэўна, больш вядомыя. Ім удаецца жыць у Польшчы без згрызотаў сумлення і без расплаты. А ў мяне не атрымліваецца. Я хачу, каб мяне судзілі

**Анка**. Няўжо вам настолькі маркотна?

**Палкоўнік**. Вы спрабуеце вывесці мяне з раўнавагі?

**Анка**. Прабачце, пан палкоўнік, але чаму б вам спакойна не дажыць свае дні? Я чула, вы любіце паляванне, часта плаваеце на яхце, падарожнічаеце...

**Палкоўнік**. Маё месца не на яхце і не на пляжы ў Тунісе. Маё месца ў турме.

**Анка**. Здароўе ў вас - дай, божа, кожнаму. І пенсія добрая...

**Палкоўнік**. Пенсія энкавэдэшная... яе на цэлую сям'ю хапіла б. Шматдзетную. Ваша задача: зрабіць так, каб у мяне яе, юрыдычным парадкам, адабралі.

**Анка**. Вы можаце самі ад яе адмовіцца.

**Палкоўнік**. Вы не разумееце. Ёсць людзі, якім не дазволена карыстацца буржуазнымі жэстамі. Гэта тое ж самае, што арганізаваць аўкцыён на карысць дзіцячага дому, на якім прадаюць карціны Гітлера.

**Анка**. Гітлер пісаў карціны?

**Палкоўнік**. Ён быў постімпрэсіяністам. Неблагім. Мяне павінны пазбавіць звання і вывесці з арміі. Я не хачу, каб на маім пахаванні іграў ваенны аркестр. Не хачу некралогаў ад імя таварышаў па службе. І ганаровых ордэнаў таксама не хачу. (Устае, падыходзіць да сакрэтніка, дастае адтуль старую бляшчаначку, вяртаецца да століка)

**Анка**. Вы хворы на галаву? А то, бачу я, вы ўласнае пахаванне прадумалі да драбніц.

**Палкоўнік**. Гэта ўсё, на жаль, прапісана ў рэгламенце. Пакуль што я яшчэ палкоўнік. А ганаровая кампанія хай ідзе піць піва.

**Анка**. Можаце напісаць у тастаменце, што адмаўляецеся ад воінскіх ушанаванняў...

**Палкоўнік**. Вось, калі ласка, Кавалерыйскі крыж адраджэння Польшчы. Якога адраджэння, якой Польшчы?! Залаты Крыж за заслугі, бронзавы, недзе тут яшчэ і сярэбраны ёсць; медаль 25-годдзя Польскай Народнай Рэспублікі, за сакавік і за Чэхаславакію; медаль трыццацігоддзя, за снежань; залаты ордэн заслужаннага дзеяча Таварыства Польска – Савецкага Сяброўства, за ўзорную работу па русіфікацыі салдат. Грунвальдскі Крыж! Я што, з крыжакамі ваяваў?

**Анка**. Можа, вам да доктара пайсці? Да псіхіятара, я не ведаю...

**Палкоўнік**. Вы спрабуеце мяне абразіць? Вось яшчэ: медаль за смеласць і адвагу – у 68- м выцягнуў дзіця з зямлянкі ў Градцы Кралавым. Прастудзіўся. Заслужаны абаронца радзімы. Хочаце, вам аддам? Афіцэрскі крыж адраджэння Польшчы – гэты ўжо ў свабоднай Польшчы атрымаў. “ Polonia Resituta” напісана. Хочаце сабе што-небудзь з гэтых жалязяк?

**Анка**. Я і не збіралася вас абражаць. Гэта такая самая хвароба, як і ўсе астатнія.

**Палкоўнік**. Я не хворы, у мяне стопрацэнтная наяўнасць свядомасці.

**Анка**. Тым больш, вам трэба паказацца доктару. Хай ён гэта пацвердзіць. Проста так.

**Палкоўнік**. Я магу паўстаць перад судом. Я абсалютна нармальны...абсалютна.

**Анка**. Вы – магчыма, а вось вашы думкі? Ні адзін нармальны чалавек не хоча ў турму, ніхто не хоча страціць узнагароды і званні. Усе хочуць жыць прыстойна.

**Палкоўнік**. Я – не ўсе.

**Анка**. Тады, можа, вам лепш з пракурорам пагаварыць?

**Палкоўнік**. Я спрабаваў. Ён прапанаваў мне... напісаць мемуары. Малады такі. Якое я маю права пісаць мемуары? Мае ахвяры ўжо ніколі не напішуць ні слова. Які сэнс пісаць гэтую кнігу? Толькі каб засведчыць, што работа забойцы добра аплачваецца? Здраджваць радзіме – цудоўна? Яшчэ і ганарар атрымаў бы. Мне за гэтыя грошы што – дачу купіць? Поле Ганчара?

**Анка**. Чыё поле?

**Палкоўнік**. Поле Крыві, няважна... Я ніколі гэта не зраблю.

**Анка**. Вам трэба проста пайсці і прызнацца.

**Палкоўнік**. Калі я сам прызнаюся ў здзейсненых злачынствах, гэта ўспрымецца як змякчаючыя віну акалічнасці. Баюся, мяне б тады асудзілі ўмоўна ці нават памілавалі б. Бязглудзіца. Не, гэта павінна быць зроблена кімсьці з боку. Нехта павінен падаць заяву аб злачынстве. І гэта бузеце вы, пані Ганна. Вазьміце гэтую бляшчанку.

**Анка**. Што ў ёй?

**Палкоўнік**. Забітыя людзі, зламаныя кар’еры, разбураныя сем’і. Камуністычная дрэнь.

**Анка**. Гэта не мая справа.

*Пайшла да дзвярэй, кешкаецца са шматлікімі замкамі.*

**Палкоўнік**. Гэта ваша справа. Вашага бацьку пакінем на дэсерт. Тлумачу вам, як маленькаму дзіцёнку: не з’ясі абед – не атрымаеш дэсерт.

**Анка**. Абед – гэта бляшанка?

**Палкоўнік**. Так. Вы – грамадзянка свабоднай дэмакратычнай краіны. Прававой дзяржавы. І як у кожнага грамадзяніна ў вас ёсць не толькі правы, але і абавязкі. Урэшце рэшт, уявіце сабе, што вы сустрэлі на вуліцы забойцу-фашыста.

**Анка**. Дзякуй Богу, у мяне няма знаёмых гітлераўцаў. Ніякіх нацысцкіх забойцаў. Як вы здагадваецеся, мне для гэтага дужа мала гадоў. Мне пара. Выпусціце мяне, зрабіце ласку.

**Палкоўнік**. Аднак жа, знаёмы камуніст – забойца ў вас ужо ёсць.

**Анка**. Гэта вашы праблемы. Я не абавязаная выслухоўваць і не абавязаная тут знаходзіцца.

**Палкоўнік**. Вядома ж, не абавязаная. Вы не абавязаны мяне выслухоўваць. Не з’ясі абед – не атрымаеш дэсерт.

**Анка**. Вы атрымліваеце задавальненне, здзекуючыся з мяне?

**Палкоўнік**. Так, вы маеце рацыю. Я ўсё сваё свядомае жыццё толькі і рабіў, што здзекваўся з людзей. Спаганяў на іх сваю помсту. За сябе. За сваю здраду. За подласць і жорсткасць. Так. А цяпер буду помсціць вам.

**Анка**. Вы - подлы...

**Палкоўнік**. Ну вось... мы пачынаем набліжацца да ўзаемапаразумення...

**Анка**. Вы самы страшны чалавек з усіх, каго я ведаю...

**Палкоўнік**. Так, і з гэтым цяжка паспрачацца. Ды гэта яшчэ не самае страшнае. Самае страшнае – тое, што не толькі ты патрэбна мне, але і я патрэбны табе. Вазьмі, напішы і... адправіш... тады раскажу табе пра бацьку.

## Сцэна 3

*Анка і Палкоўнік стаяць, п’юць на брудэршафт, цалуюцца, б’е гадзіннік з “кукушкай”.*

**Анка.** Анка.

**Палкоўнік.** Стэфан… Упершыню п’ю на брудэршафт парэчкавы сок.

**Анка.** Гэта аронія.

**Палкоўнік.** Бачыш, я ўжо смакі не распазнаю.

*Садзяцца. Палкоўнік рэзка ўстае, ідзе ў свой пакой, вяртаецца са стосікам раздрукаваных лістоў.*

**Палкоўнік.** Прачытаў. Чатыры разы прачытаў. Даўгавата, але напісана добра. І пракурору, і суддзям чытаць будзе не сумна. Бадай, нават дужа добра. Некаторыя фармулёўкі пракурору давядзецца перапісаць у акт абвінавачвання. Разам з рэчавымі доказамі і сведчаннямі відавочцаў пацягне на добрыя восем гадоў. Нават калі я поўнасцю прызнаю віну і раскаюся.

**Анка.** Зрабіла, як магла. Спадзяюся, сведкі не пабаяцца даваць паказанні.

**Палкоўнік.** Ну, ведаеш, мы ў свабоднай краіне жывём. Не чула пра гэта? Арол зноў у кароне.

**Анка.** У кароне.

**Палкоўнік.** Я сам прызнаюся. Гэта надасць ім смеласці.

**Анка.** Ты не баішся?

**Палкоўнік.** Чаго?

**Анка.** Ты лепей ведаеш. Падам заяву пра злачынства, з’явяцца доказы, цябе арыштуюць, ты пачнеш гаварыць, а потым цябе раптам знойдуць мёртвым у камеры.

**Палкоўнік.** *(на хвіліну задумваецца. Невялікі глыток соку).* Аронія? Што гэта такое?

**Анка.** Не ведаю. Думаю, гэтага ні адзін нармальны чалавек не ведае.

**Палкоўнік.** Гэта што – грыб, ягада, агародніна? Ці яно на дрэвах расце? Ну, не бегае, гэта гарантыя…

**Анка.** Напэўна, ягады. Напішуць дробным, вельмі дробным шрыфтам, што зламаны арыштам палкоўнік учыніў самагубства, або турэмны ўрач выявіць сардэчную недастатковасць. І справу замарозяць. Многія ўздыхнуць спакойна. І зноў усталюецца ў Варшаве ціша ды боская ласка.

**Палкоўнік.** Век жыві, век вучыся – яблычны піў, парэчкавы піў. Можа, гэта які-небудзь новы цытрус?

**Анка.** Ты лепш за мяне ведаеш, што якраз гэтым можа і скончыцца. Новага Нюрнберга не будзе.

**Палкоўнік.** Гэтым не можа скончыцца. Застанешся ты.

**Анка.** Я? Што я магу зрабіць?

**Палкоўнік.** Апублікуеш кнігу. Выратуеш ад хлусні і забыцця.

**Анка.** Кніга – гэта не Нюрнберг.

**Палкоўнік.** Калі гэта здарыцца – я прайграў. Можа, так мне, урэшце, і трэба. Яшчэ адна ахвяра. У камуне гэта звычайны, нават банальны лёс – учора бунтар, сёння забойца, заўтра ахвяра. Звычайная справа.

**Анка.** Звычайная? Ты ж хацеў, каб адбыўся працэс, а не смерць пры загадкавых абставінах.

**Палкоўнік.** А можа ў іх не атрымаецца самагубства? Нельга з самага пачатку настройвацца на горшае.

**Анка.** І ўсё ж такі?

**Палкоўнік.** Значыць, нічога не выйдзе. Выходзіць, прайграю. Але, прынамсі, ты будзеш ведаць, чаго я дамагаўся. Не-е, мяне не могуць забіць. Вышэйшая воля дапаможа мне дажыць да канца, да прысуду.

**Анка.** Вышэйшая воля? Ты ж не верыш у Бога.

**Палкоўнік.** Часам веру. Ай, ды што там. Справядлівасць павінна перамагчы. Зразумей, той афіцэр, які мяне завербаваў, ён сказаў, каб я выбраў жыццё. Жыццё за любую цану. Нават за цану здрады. Што, магчыма, я калі-небудзь… потым… на што-небудзь прыдамся. Што змагу яшчэ зрабіць што-небудзь карыснае.

**Анка.** Я разумею.

**Палкоўнік.** Я ўжо стары, гэты працэс – гэта ўсё, што я магу даць. Усё, што магу атрымаць. Я ж, як-ніяк, не самы кепскі чалавек на свеце. Гэта мой працэс. І мой прысуд.

**Анка.** Я разумею. Ты думаеш, што твой працэс прадухіліць хлусню да канца гісторыі?

**Палкоўнік.** Я эгаіст. Хачу памерці, але паквітацца. За злачынствы трэба плаціць. На жаль, я дачакаўся падзення камуну. Я быў наіўны, верыў, што новая Польшча прыцягне мяне і такіх, як я, да адказнасці.

**Анка.** Ты сапраўды ў гэта верыў?

**Палкоўнік.** Так, верыў, што расплачуся за сваё жыццё. Што мне дадуць такі шанс.

**Анка.** Гэта з тваім вопытам? Верыў у што? Што справядлівасць стане асновай Трэцяй Рэспублікі?

**Палкоўнік.** Так, шчыра верыў. Нейкім чынам спыніўся ў развіцці. Замарозіўся. Усё свядомае жыццё пражыў, як той васемнаццацігадовы хлапчук, якога аднойчы паставілі перад выбарам: магіла ці здрада. Адзіным выратаваннем для мяне магла стаць, хіба што, Трэцяя Сусветная. Але нават тады я разумеў, што вайна, сусветная вайна, ужо немагчыма.

**Анка.** Доўга ты прымаў рашэнне. Пасля атрымання незалежнасці ўжо столькі гадоў праляцела.

**Палкоўнік.** Сам у турму не спяшаўся. Я ж казаў: спачатку чакаў, што да мяне такі ж дабяруцца. Потым падумаў, што, напэўна, ёсць нейкі сэнс у гэтым усеагульным дараванні яўнай віны. Можа і сапраўды так будзе прасцей пачаць нармальнае жыццё, калі як найхутчэй пра ўсё гэта забыць. Пакаралі сябе адзін раз, а цяпер – усеагульны мір і спакой.

**Анка.** І што?

**Палкоўнік.** Як гэта – што? Тое, што выйшла! Краіна такая, якая ёсць! Памяць немагчыма ампутаваць. На яе месцы вырасце хвост хлусні. Ёсць Fiat, вялікі Fiat, лазенкаўская траса, катавіцская шаша - фантастычны поспех! Старыя твары, якія выйшлі з ужытку. Так званыя “спецыялісты”. Лухта пра роўнасць шансаў у ПНР, пра работу для ўсіх.

**Анка.** Адзін твой судовы працэс, хай сабе нават самы гучны, гэтага не спыніць.

**Палкоўнік.** Я і не разлічваю, што ён будзе дужа гучны. Па праўдзе кажучы, пытанне ўва мне. Я павінен знайсці тое, што калісьці ўва мне было, і чаго больш няма… Разумееш?

**Анка.** Годнасць? Гонар?

**Палкоўнік.** Годнасць, гонар? Гэта занадта. Хопіць чалавечнасці. Бачыш, дзе я жыву, хто жыве побач са мной. Я не хачу больш шашлыкоў з ваеннымі пракурорамі, не хачу гуляць у прэферанс з адстаўнымі паліцэйскімі.

**Анка.** А калі цябе выставяць вар’ятам? Падсыплюць парашок у ежу, пачнеш скакаць упрысядкі перад судом, палезеш цалавацца з пракурорам? Ці мала што яны могуць зрабіць.

**Палкоўнік.** Слушная заўвага. Стolькіх звялі з розуму. Аднаго так, другога гэтак. Бадай, не буду есці перад слуханнямі.

**Анка.** Нешта ж трэба будзе есці. Або адправяць пад нагляд псіхіятра.

*За зачыненымі дзвярамі брэша сабака.*

**Палкоўнік.** Та-ак. Гэта было ў іх стылі. Дакладней, нашым. Знайшліся б нават сведкі маіх неадэкватных паводзін. Сведкі, якім павераць. Тады табе давядзецца… пазмагацца за мяне, Анка.

**Анка.** Як?

**Палкоўнік.** Знойдзеш спосаб. Помні – без гэтага працэсу героі застануцца здраднікамі, а здраднікі…

**Анка.** Героямі?

**Палкоўнік.** Пачэснымі пенсіянерамі. Прэферанс, кава з бальзамчыкам, скаргі на здаровейка, на ўрад, на гэтую галоту, якая таксама мае права на жыццё. На жаль.

**Анка.** Іх спакой ніхто не парушыць.

**Палкоўнік.** Твой бацька…

**Анка.** Мой бацька не дажыў да пенсіі.

**Палкоўнік.** У тым вось і справа, яны б хаця будуць ведаць, што быў такі чалавек, як твой бацька, што не трэба было станавіцца падхалімам, які нізкапаклоннічае перад уладай і апярэджвае пажаданні партыі.

**Анка.** Мой бацька быў партыйцам.

**Палкоўнік.** Усе афіцэры былі, і сержанты амаль усе. Усё кіраўніцтва, дырэктары, уся гэтая шматмільённая бюракратыя, гэтая "народная ўлада". Усе. Ім давалі талоны на машыну, скарачалі чаканне ў чарзе на жыллё з пятнаццаці да дзесяці гадоў… Партыйным жылося лепш. Кралі, здраджвалі, выбівалі сабе пуцёўкі, накіраванне ў санаторый "для хворай мамы…" Ды ты сама ведаеш. Калі б твой бацька не быў партыйцам, ён ніколі б не стаў афіцэрам, маёрам, не камандаваў бы батальёнам.

**Анка.** Увогуле, навошта табе спатрэбіўся мой бацька? Ты ж працаваў у контрразведцы. Ты ж павінен быў, напэўна, шпіёнаў лавіць. Захоўваць ваенную тайну…

**Палкоўнік.** Дзетка, якіх шпіёнаў? Якую тайну? Згодна маёй інфармаванасці, контрразведка не злавіла ніводнага шпіёна.

**Анка.** Як гэта? Былі ж працэсы… прысуды…

**Палкоўнік.** Знайшоўся які-небудзь занадта языкаты сержант, п'яніца, якому грошай хацелася ад ЦРУ на гарэлку…

**Анка.** А той спявак? Яму ж дваццаць пяць гадоў далі, ён сам прызнаўся…

**Палкоўнік.** Спявак? Шпіёны, вядома ж, былі, толькі нам іх не ўдалося злавіць. А з ім было зусім проста. Ён быў, па сутнасці, наш чалавек. У генералаў былі пласцінкі з яго аўтографамі. Быў членам Народнай лютвы, партыі, таварыства савецка-польскага сяброўства. Грамадскі інспектар дарожнага руху. Ездзіў з канцэртамі па гарнізонах. Што ён мог бачыць? Афіцэрскія сталоўкі і спартзалы. Любіў жанчын, машыны, а на гэта грошы трэба, ну і запазычыўся аднаму амерыканскаму дыпламату. Яшчэ ў покер гуляў.

**Анка.** І што? Перадаваў інфармацыю амерыканцам? Але вы злавілі яго ўсё ж такі? Быў жа абмен на мосце ў Берліне, на дырэктара Певекса?

**Палкоўнік.** Ну так, але мы яго памылкова ўзялі. Ён быў любімчык генеральскіх жонак, спяваў ім у дні народзінаў песенькі Сінатры і Магамаева. Кожны год быў гваздом праграмы артфестывалю салдацкай песні. Жор, жор, і адным цудоўным днём абажраўся. Атрымаў залаты пярсцёнак, ці кольца, ужо не помню, як гэтая ўзнагарода называлася. Песня стала хітом лета, дзеці ў садках спяваюць, радыё круціць цэлымі днямі. І раптам нейкі журналіст, я яго добра не помню, сваалачны быў сукін сын, да ўсяго чапляўся, і вось ён, гэты гнайнік, піша ў газеце, што гэты хіт – плагіят. Цэнзар паведаміў арміі…

**Анка.** За плагіят атрымаў дваццаць пяць гадоў?

**Палкоўнік.** Ну што ты… Гэта быў не абы-які плагіят. Ён украў мелодыю з Horst Wesel Lied: "Die Fahnen hoćh, die reine dićht gesslosen, SA marsćhiert mit ruigen festen sćhritt." Ведаеш гэта?

**Анка.** Нацысцкі марш?

**Палкоўнік.** Гэта гімн СС, песня, прысвечаная памяці сутэнёра, забітага яшчэ адным альфонсам, якому той быў вінаваты грошы за дурман… І ў іх былі… годныя героі.

**Анка.** Так, значыць украў мелодыю з Horst Wesel Lied?..

**Палкоўнік.** Усчаўся шум, таму што ён запісаў гэта яшчэ і для кінахронікі. Відэакліп – так гэта цяпер называецца.

**Анка.** І што?

**Палкоўнік.** Нам параілі з гэтым разабрацца.

**Анка.** Контрразведка займалася такімі рэчамі?

**Палкоўнік.** Ты што, не разумееш? Наша дарагое народнае сацыялістычнае войска маршыравала ў рытме гітлераўскага марша. Добра яшчэ, што на Захад гэта не прасачылася. Трэба было з ім разабрацца. Даручылі гэта маладому капітану, які свята верыў у Народную Польшчу, таму што іншай вочы яго ніколі не бачылі. Паслаў той пеюну павестку, прыходзіць гэты “звяздун”, а ён яму адразу не ў брыво, а ў вока: “Як так можна?! Такую свінню роднай бацькаўчыне!” Але ў чым справа, не гаворыць.

**Анка.** Не хочаш расказваць?

**Палкоўнік.** Хачу. Якраз пра гэта і хачу. І гэты ідыёт раптам… замармытаў… што яму цяжка, што ён не можа болей жыць з гэтым… І прызнаецца ў шпіянажы. Капітан аслупянеў – ён не быў дурнем, адразу ўцяміў, што такое Захад ужо не прапусціць міма вушэй. Да таго ж, ён упершыню, на свае вочы, убачыў амерыканскага шпіёна. Паклікаў мяне, яшчэ аднаго афіцэра, хацеў, каб былі сведкі, выпілі раз, другі, а потым пракурор загадаў… Арышт, вобыск… Сына, студэнта, запалохалі ледзь не да смерці, хацелі каб сведчыў супраць бацькі… Вось так…

**Анка.** І што?

**Палкоўнік.** Гэта і быў шпіён, якога мы злавілі. Вялізны поспех! Званні і ўзнагароды ці не сотні афіцэраў. Грунвальдскі крыж – гэта за яго.

**Анка.** Чым вы тады займаліся?

**Палкоўнік.** Я табе ўжо некалькі тыдняў пра гэта гавару – устранялі непажаданых людзей. Апазіцыю.

**Анка.** У арміі была апазіцыя?

**Палкоўнік.** У арміі? Адкуль? Мы займаліся грамадзянскімі – Камітэтам абароны працоўных, Канфедэрацыяй незалежнай Польшчы, Салідарнасцю... карацей, усёй гэтай брацiяй. Касцёлам, зразумела.

**Анка.** Касцёлам? Ваенная разведка?

**Палкоўнік.** Касцёл, Ватыкан быў для Масквы другім, па значнасці, ворагам, адразу пасля Амерыкі. Чаму вас у школе вучаць? Ды і ўвогуле, пра што мы тут гаворым?

*Палкоўнік устае, падыходзіць да шафы, ці не хвіліну робіць выгляд, што нешта шукае, потым выцягвае скрутак матэрыі, раскручвае, вешае на шафу, цераз увесь пакой. Гэта трохі выцвілы транспарант з надпісам "МЫ – ТВАЕ ДЫВІЗІІ". Папраўляе, садзіцца.*

**Анка.** Мы - твае дывізіі? Што гэта значыць?

**Палкоўнік.** Тое і значыць. Калісьці, яшчэ да вайны, Сталін спытаўся ў французскага міністра Лаваля: "Папа Рымскі? А колькі ў яго дывізій?" Праз пяцьдзесят гадоў забароненая Салідарнасць сустракала нашага Папу. Была імша на стадыёне дзесяцігоддзя, там, дзе цяпер рынак. Некалькі студэнтаў расцягнулі гэты транспарант. Вечарам горад абляцела чутка, што органы бяспекі схапілі некалькі членаў узброенага падполля-тэрарыстаў. Гэта былі тыя самыя хлопцы з транспарантам. Тэрарысты, разумееш. Узброенае падполле. Гэта ўжо – за справу контрразведка. Бяру з сабой пару жандараў, прыязджаем туды. Яны іх дапытваюць у памяшканні цэнтральнага вакзала, у камісарыяце чыгункі. Усе камісарыяты перапоўненыя, таму завезлі на вакзал. Смурод, як у грамадскім сарціры, цесна, уваходжу, прадстаўляюся. Тэрарысты – гэта наш клопат. Сядзяць менцяра і студэнт, прыемны такі хлопец, з Інстытута фізкультуры. І гэты мент, свіная морда ў скураной куртцы, мне транспарант паказвае, і тлумачыць што яны, маўляў, партызанская дывізія.

**Анка.** Жартуеш?

**Палкоўнік.** Не. І пытаецца ў студэнта, дзе дыслацыруюцца іх падраздзяленні, колькі дывізій, у якіх лясах.

**Анка.** Не веру.

**Палкоўнік.** Я таксама. Афіцер – спецагент пасля вучобы – мазгі прамытыя начыста. Хлопец яму, як дзіцяці, тлумачыць, што Сталін, што Лаваль, што мерафара. А гэты дэбіл усё пра сваё – дзе дывізіі? Якое ўзбраненне? У якой валюце сродкі? Фантаст...

**Анка.** І што?

**Палкоўнік.** Нічога. Я ўзяў пытанне на сябе, залучыў жандараў. А жандары – са штыкамі на карабінах, дубінкі, самі здаравенныя амбалы,- выцягнулі студэнтаў з гэтага сарціра. Ён, гэты менцяра, яшчэ хацеў чагосьці... каб я нейкую паперу яму падпісаў. Прыкрыкнуў на яго – сказаў пару ласкавых... Выйшлі мы з вакзала, я хлопцаў адпусціў, а транспарант пакінуў сабе на памяць.

**Анка.** А жандары што? Нічога не пыталіся?

**Палкоўнік.** Жандары? Гэтыя ніколі не пытаюцца... нічога. На тое яны і жандары.

**Анка.** Дык ты адпусціў іх? Велікадушна. Тады ты займался маім бацькам?

**Палкоўнік.** Ты ўсё- такі хочаш, каб я расказаў пра яго?

**Анка.** Закончылі з абедам – час пераходзіць да дысерта. Я не буду пісать пра гэта ў артыкуле, каб гэта не выглядала як асабістая помста.

**Палкоўнік.** Помста аднаўляе парушаны парадак.

**Анка.** Гэта сярэдневяковае сцверджанне. Раскажы пра бацьку. Я помню, што тады часта бегала ў аптэку.

**Палкоўнік.** Так, гэта ўжо набліжаўся канец. Ён ужо прасіў дапамогі ў ваеннага псіхіятра. Наіўны быў твой бацька, думаў, што псіхіятр не наш. А ён, зразумелая рэч, быў інфарматарам.

**Анка.** Гэта подла - выкарыстоўваць урача-псіхіятра супраць пацыента.

**Палкоўнік.** Вам у школах не расказваюць пра псіхушкі? Пра бальніцы, дзе гадамі трымалі апазіцыянераў і кармілі псіхатропнымі прэпаратамі?

**Анка.** Гэта было пры Савецкім Саюзе.

**Палкоўнік.** Зразумелая рэч, пры Саветах. У ГДР апазіцыянераў знарок апрамянялі, каб выклікаць пухліну, у Румыніі былі канцэнтрацыйныя лагеры, у Чэхаславакіі спакладалі цыганоў. А Польшча затое была аазісам шчасця, сяброўства і спачування. Самы вясёлы барак. Хто выдумаў гэтую лухту?

**Анка.** Што вы зрабілі з бацькам? Што вы з ім зрабілі?

*Тэлефонны званок. Палкоўнік усхопліваецца і падыходзіць да тэлефона.*

**Палкоўнік.** Айн момант. Каладзей, слухаю... Дабрыдзень, добры дзень, сынок, што ў вас чуваць? Во-о, здорава. Стэфан? Значыць, гэта па-вашаму як будзе?.. Сцівен? Прыгожа. Ёсць матулька, ёсць... І як там? Дваццаць восем градусаў... До-обра, а ў нас чатыры. Дождж ідзе... морак... Зараз маму паклічу. Зося! Марэк звоніць! *(Падыходзіць да зачыненых дзвярэй з замкамі, стукае)* Ужо ідзе. Ну-у, да вас далекавата... Я ведаю, але тут, разумееш... Нам абаім ужо цяжка сябе мабілізаваць... Ну вось, мама ўжо тут... Цалую. І малыша Сцівена таксама. Сцёпку, так. Бывай. *(Кладзе трубку. Садзіцца. Маўчанне. Палкоўнік не-не ды паглядвае на тэлефон. Анка спрабуе сабрацца з думкамі, каб што-небудзь сказаць. Палкоўнік яе апярэджвае.)* У адносінах да твайго бацькі давялося прымаць выключныя меры. Іх колькасць была... Карацей, такое нагрувашчванне подласці мы ўжывалі толькі да трупаў і ўцекачоў. Да людзей, якіх або ўжо не было сярод жывых, або яны былі па-за нашай дасяжнасцю, на Захадзе. Традыцыйна пачалі з сям'і. Твой бацька быў арыйцам. Ведаеш такое слова? Горш за ўсё тое, што ён быў усяго толькі на чвэрць немец. І да таго ж, ён быў з Лодзі. Там было шмат паўкровак. Мы з калегамі пусцілі чутку, што яго маці была звязана з рэйхам у час вайны і працавала ў гестапа перакладчыцай.

**Анка.** Бабулю туды выправіла Армія Крайёва. Быў жа працэс і гэта ўсё...

**Палкоўнік.** Анютка, хто там стаў бы ўнікаць у такія дробязі... А потым мы сфабрыкавалі крымінальную аповесць. Прыроджаны дзетазабойца, сёння сказалі б педафіл, меў у гэтай аповесці прозвішча Хенрык Візнер. Быў упарты, як твой бацька. І ў яго была жонка і дачка. У фінальнай сцэне маленькая Анютка расказвае міліцыі, як яе бацька мыў штаны, запэцканыя крывёю ахвяр. Мы паклапаціліся аб тым, каб кніжка трапіла куды трэба, расходавалі сто пятьдзесят тысяч. Ваенныя бібліятэкі, хвалебныя рэцэнзіі, прэса, радыё, тэлебачанне.

**Анка.** Як вы гэта напісалі?

**Палкоўнік.** У нас свае пісьменнікі былі яшчэ ў васьмідзесятыя. Рэжысёр Міланоўскі хацеў гэту гісторыю зняць, напісаў сцэнарый, але, на жаль, з тваім бацькам здарылася тое, што здарылася, і здымкі спынілі, а кнігі пазабіралі з бібліятэк.

**Анка.** Што гэта павінна было даць?

**Палкоўнік.** Ён павінен быў пайсці з арміі. Павінен быў сам пайсці. Вядома ж, мы маглі яму арганізаваць працэс – за крадзеж бензіну з танкаў. Бензіну, зразумела, і так не было, бо ўсюды кралі. Мы маглі б павыкрываць, "павесіць" на яго цэлы тузін злачынстваў. Самазабойства салдата, зацюканага калегамі. Маглі б яму пакласці дзеўку, зрабіць здымкі, паслаць жонцы. Маглі, зразумела, разыграць няшчасны выпадак з п'яных вачэй, хаця піў ён меньш за многіх. Усё маглі. Але гэта ўсё былі прымітыўныя рашэнні. Мне трэба было штосьці зусім іншае.

**Анка**. Што?

**Палкоўнік.** Падсвядома я хацеў яго праверыць. Можа, нават дапамагчы хацеў яму. Чапляўся да яго, зразумела, але думаў, што, можа, тое, што яго не заб'е, зробіць яго мацнейшым.

**Анка.** На жаль, забіла.

**Палкоўнік**. Хочаш мяне задушыць? Калі ласка…

**Анка**. Давай далей…

**Палкоўнік**. Тады я ўспомніў пра шахматы.

**Анка**. Пра шахматы?

**Палкоўнік**. Так, пра шахматы. Твой бацька вар'яцеў ад іх. Уяві сабе: ведаў усе партыі Карпава з Карчным, усе гэтыя гамбіты, абароны, скачок на С4… Гэтая страсць і загубіла яго.

**Анка**. Значыць, шахматы. Не ты.

**Палкоўнік**. Камбінацыя была на дзіва простая. У Савецкім Саюзе шахматы былі справай дзяржаўнай важнасці. Дваццаць мільёнаў членаў у саюзе шахматыстаў, куча грошай выдаткоўвалася на адны толькі шахматныя выданні. Шахматы – драўляны карабок, шэсцьдзесят чатыры палі, шаснаццаць белых фігурак, шаснаццаць чорных…

**Анка**. Я ведаю, што такое шахматы.

**Палкоўнік**. Пасля паўстання Салідарнасці Саветы значна ўмацавалі ў нашай краіне свае, назавём гэта – прадстаўніцтвы. Кантора гандлёвага саветніка парадкам разраслася. Сярод іншых з'явіўся тады Кірылаў, Уладзімір Міхайлавіч Кірылаў. Сімпатычны хлопец, шустры, жонка ў яго была прыгожая. Тамара. Гэта было ўжо новае пакаленне русскіх. Яны ведалі мовы, елі нажом з відэльцам. І не пілі. Ці то не нажыраліся.

**Анка**. Помню… дзядзька Валодзя і цёця Тамара…

**Палкоўнік**. Абое з ГРУ. З ваеннай разведкі. Яна сапраўды была прыгожая, неўзабаве ў нас дзіця нарадзіла.

**Анка**. Яны мне прыносілі матрошак. Здаецца, гэта так называлася.

*Палкоўнік устае, падыходзіць да камоды, ставіць на стол матрошку, пачынае з ёю забаўляцца. Выстаўляе іх цэлы шэраг – ад маленькай да вялікай.*

**Палкоўнік**. Во-во, дзяддзька Валодзя і цёця Тамара… Ён быў страстным шахматыстам. Ужо сярод юніёраў быў віцэ-чэмпіёнам Ленінграда. А тут яму няма з кім гуляць. Польскія

шахматысты баяліся яго, як агню. Урэшце ж, было ваеннае становішча, усе палякі пазбягалі кантактаў з расейцамі.

**Анка**. Відаць не ўсе

**Палкоўнік**. Вядома, заўсёды знаходзіліся і такія, хто ў замежных пасольствах рабілі сабе кар'еру. Я зараз пра нармальных людзей гавару. Трэба было бедаку-шахмтысту арганізаваць якога-небудзь партнёра. Ты нават і ўявіць сабе не зможаш, колькі было жадаючых. Раптам усе як адзін пачалі рашаць двухходовыя.

**Анка**. Двухходовыя?

**Палкоўнік**. Шахматныя задачы, якія друкаваліся ў газетах, дзе трэба было белымі за два хады паставіць мат. Два крокі. Шах-мат. Чорныя заўсёды асуджаны на пройгрыш.

**Анка**. І што?

**Палкоўнік**. І тады я разыграў сваю двухходоўку. Першым ходам перасунуў твайго бацьку ў Варшаву.

**Анка**. Помню. Мы пасяліліся ў Жаліборы.

**Палкоўнік**. Даваенная армейская калонія. Другі ход быў больш просты – трэба было «сяброў» пазнаёміць. Часць накіравала твайго бацьку да Кірылава на перамовы пра новыя патранташы для танкаў Т-72. Адна сустрэча, другая, разгаварыліся, зусім выпадкова, пра агульную страсць. І … сталі прыяцелямі.

**Анка**. Памятаю, мы разам плавалі на лодцы па заліве.

**Палкоўнік**. Вось імена – на лодцы па заліве. Нехта іх убачыў разам на прыстані, хтосьці дзесьці сказаў некалькі слоў пра гэтае сяброўства. Гэта і быў пачатак канца твайго бацькі.

**Анка**. Я нешта выпусціла з-пад увагі.

**Палкоўнік**. Нічога ты не прапусціла. З'явіліся чуткі, што твой бацька – агент ГРУ. Мне нават не давялося іх распаўсюджваць. Дастаткова было проста не пярэчыць.

**Анка**. Мой бацька? Гэта ж абсурд!

**Палкоўнік**. Тады ўсё было абсурдам.

**Анка**. Я не разумею. Саветы ж і так усё ведалі, усё кантралявалі. Навошта ім быў яшчэ і агент?

**Палкоўнік**. Сачыць за іншымі афіцэрамі. Для, так бы мовіць, маніторынгу іх лаяльнасці. Шукаць зачэпкі, каб не падвялі ў час праверкі. Саветы рыхтаваліся да вайны. Ім трэба было ведаць, хто з афіцэраў, радавых афіцэраў, не будзе вагацца аддаючы загад гарматнаму мясу, гэта значыць польскай народнай арміі, загад наступаць. Хто будзе страляць у спіны непаваротлівым салдатам, а хто не. Хто здатны на тое, каб утапіць сваіх салдат у іх уласнай крыві, як іх тапілі пад Леніна ці Будзішыным. Для гэтага Саветам патрэбны былі агенты ў польскім войску. Ты спыталася, я адказаў. Цяпер ты ведаеш.

**Анка.** Але мой бацька проста гуляў у шахматы.

**Палкоўнік.** І катаўся на лодцы. Ён не быў агентам. Але ўсе лічылі яго за агента. Афіцэры перагаворваліся паміж сабой, а мы гэтыя размовы падсцёбвалі. І ў іх усе факты выстройваліся ў цэльны лагічны ланцужок. Пасля таго, што ён зрабіў падчас ваеннага становішча, тады, у Гданьску, на верфі…

**Анка.** Што ён зрабіў?

**Палкоўнік.** Ты не ведаеш? Праўда, не ведаеш?

**Анка.** Не ведаю. Хто мне мог расказаць?

**Палкоўнік.** І то праўда. Я табе расскажу. Твой бацька пад Гданьскай верфю, у калысцы Салідарнасці, 14 снежня, на другі дзень пасля таго, як было абвешчана ваеннае становішча, стаў здраднікам. Перайшоў на бок ворага. У часы баявой гатоўнасці.

**Анка.** Што ён зрабіў?

**Палкоўнік.** Паабедаў.

**Анка.** Паабедаў?

**Палкоўнік.** Паабедаў. Узяў танкістаў, пайшоў на верф, і паабедаў з забастоўшчыкамі. Даў забастоўшчыкам слова гонару, што яго танкі не будуць атакаваць верф. Разумееш?

**Анка.** Разумею. Ён стрымаў ваенную прысягу. Прысяга абавязвала яго стаяць на варце заваёў рабочых людзей у гарадах і сёлах. Салідарнасць, рабочыя і грамадзянскія свабоды і былі іх заваёвамі.

**Палкоўнік.** Ён дазволіў уставіць у люкі танкаў флагі Салідарнасці. У мегафоны крычалі: “Гэта больш не танкі Ярузельскага, гэта польскія танкі.” Ты разумееш, крычалі: польскія танкі.

**Анка.** Ну і што? Вы ж усё роўна разбурылі і верф, і шахту, фабрыкі, заводы…

**Палкоўнік.** Натуральна. Ноччу танкі твайго бацькі былі адкліканы з верфі. Прыехалі іншыя. Гэта ўжо былі не польскія танкі, гэта былі танкі Ярузельскага. Іх камандзір ведаў, што рабіць.

**Анка.** Ваеннае становішча было меншым злом.

**Палкоўнік.** Не. Гэта было большае зло. Гэта было самазабойства. У 1980-м людзі выпрасталіся, паднялі галовы, сталі жыць па-чалавечы. А мы ім пераламалі гэтыя выпрастаныя спіны. Самі сабе іх перабілі. Гэта быў канец Польшчы. Самазабойства. Польшча ўжо не падымецца з гэтага на працягу многіх пакаленняў. Пераблыталіся паняцці, мы навучыліся пляваць … на саміх сябе, саміх сябе ненавідзець.

**Анка.** Навошта гэты пафас?

**Палкоўнік.** Самі на сябе глядзім, як на гістарычных няўдачнікаў.

**Анка.** Словы… Высокія словы.

**Палкоўнік.** Так, высокія. А ты задумайся… праз шмат гадоў пасля тых падзей у Польшчы няма добрых , прыстойных людзей, а гісторыю стваралі агенты і здраднікі.

**Анка.** Не падказвай мне, што я павінна думаць.

**Палкоўнік.** І піць ты пачала таму, што табе было камфортна ў сваім асяроддзі, у сям’і было на каго абаперціся. І развялася з той жа прычыны. Іменна таму напісала заяву на стыпендыю, шукаеш работу ў Брусэлі. Таму што табе добра ў сваёй роднай краіне, спароджанай чарцямі?

**Палкоўнік.** Чарцямі. Крывасмокамі. Ваўкалакамі. А твой бацька, маёр Міхаіл Візнер, тады яшчэ капітан Візнер, зрабіў так, як павінен быў зрабіць кожны з нас. Перайшоў да тых, каго прысягаў абараняць.

**Анка.** Калі б не ваеннае становішча, было б уварванне – сотні, можа, тысячы забітых і параненых.

**Палкоўнік.** Не было б. Былі ж, урэшце, дакладныя інструкцыі на ўвод войскаў. Кожны член Салідарнасці ведаў іх напамяць.

**Анка.** І Саветы спалохаліся б? Рональда Рэйгана, Леха Валенсы ці Ганны Валенціновіч?

**Палкоўнік.** Саветы паміралі. У іх не было гаспадарчай самадастатковасці. Яны на Захадзе куплялі збожжа. Яны не маглі ўварвацца, таму што па вушы загрузлі ў Афганістане. Ды ўрэшце, каб і ўвайшлі, то ўпалі б яшчэ ніжэй, чым былі.

**Анка.** Гэта спекуляцыі. Не помніш, што было ў Будапешце ў 56-м? Колькі венграў загінула?

**Палкоўнік.** А ў Чэхаславакіі? Ведаеш, колькі народу загінула ў час нашага ўварвання ў Чэхаславакію?

**Анка.** Не ведаю.

**Палкоўнік.** Пяцьдзесят. Па ўсёй краіне. Помніш, колькі людзей загінула ў снежні 1970-га, за тры дні? У чатырох гарадах. Ад куль польскіх салдат і міліцыянераў.

**Анка.** Сорак пяць.

**Палкоўнік.** Афіцыйна. Неафіцыйна ж больш за сто.

**Анка.** Гэтыя падлікі не маюць сэнсу.

**Палкоўнік.** Маюць, таму што пашанцавала, так бы мовіць, абысціся малой крывёю. І менавіта Салідарнасць выбрала гэты шлях, калі не распачала гвалтоўнага супраціўлення. Гэта заслуга народа. Мы ў войсках былі гатовыя да соцень, калі не тысяч ахвяр.

**Анка.** І хто так гаворыць?

**Палкоўнік.** Усе так гавораць. Саветы, рускія – жорсткія людзі. Немцы – прыроджаныя злыдні. А палякі што? Белыя пальчаткі, запрашэнні на гарбату? Цыгаркай пачаставаць? Катаванні ў сутарэннях спецслужбаў былі яшчэ больш вытанчыныя, чым у Гестапа. Я ведаю, што кажу, бо знаёмы з людзьмі, якія праводзілі такія працэдуры і тут, і там. А АМАП? Хлопцы з АМАПа адчувалі сябе паўнавартаснымі толькі калі ім у твар крычалі: Гестапа! Гестапа!

**Анка.** Гэта ўсё і так вядома. Раскажы мне пра бацьку. Як вы пачалі яго “распрацоўваць”?

**Палкоўнік.** Я пачаў. Якраз там быў. Бачыла б ты – польскія рабочыя сардэчна вітаюць польскага афіцэра і польскіх салдат. І гэты голас з мегафона: “Гэта больш не танкі Ярузельскага, гэта польскія танкі.” Упершыню пасля Другой Сусветнай вайны польскае войска, хай сабе толькі малая яго частка, апынулася там, дзе трэба. Твой бацька перайшоў на правільны бок...

**Анка.** Дык для цябе гэта быў правільны бок?

**Палкоўнік.** Безумоўна. Правільны бок ёсць заўсёды.

**Анка.** І што было далей?

**Палкоўнік.** Ваеннае становішча стала канцом Польшчы. За тысячу гадоў рознае здаралася ў нашай гісторыі, але ваеннае становішча – гэта было як забойства дзіцяці.

**Анка.** А што нарадзілася?

**Палкоўнік.** Нарадзілася жывая Польшча. Наша. Сапраўдная. Якая помніць і клапоціцца пра ўсіх сваіх грамадзян. Гордая. Але без гэтай сённяшня сранай ганарлівасці. Польшча маладая, адкрытая і смелая. Не ахвяра і не папрашайка. Жывая краіна для жывых людзей.

**Анка.** Такой Польшчы ніколі не было.

**Палкоўнік.** Была. І, можа, яшчэ будзе. Гадоў праз сто, дзвесце. Я яе не ўбачу. І ты таксама.

*Стук у дзверы з другога пакоя. Палкоўнік усхопліваецца, хапае тэлефонную трубку.*

**Палкоўнік.** Так, сынок... Так. Не-не, справа не ў грошах. На білет у мяне ёсць... Не ў гэтым справа. Ну што мне там рабіць? У гольф я не ўмею... А тут у мяне работа. Мне добра тут. Трэба закончыць сёе-тое, старыя справы. Не, толькі тут магу гэта зрабіць... Ага. Ды не, нічога не ўтойваю, проста... Сынок, старыя дрэвы не перасаджваюць. Пры чым тут прымаўка? Прабач, у мяне госць. *(Паклаў трубку)* Спатрэбіўся б дзядуля ўнукаў нянчыць...

**Анка.** Раскажы... Што з ім было далей?

**Палкоўнік.** Ён павінен быў пайсці з арміі. Уяві сабе: размовы сціхалі, калі ён з’яўляўся. Яго ніхто не запрашаў у госці, ніхто не размаўляў з яго жонкай. На двары дзеці з табой гулялі?

**Анка.** Гулялі.

**Палкоўнік.** Гулялі? А маці іх не клікалі дадому, калі цябе бачылі? На ранішнікі цябе запрашалі?

**Анка.** Тады, напэўна, было не да гэтага.

**Палкоўнік.** Да гэтага было, да гэтага. У блоку дзеці афіцэраў трымаліся разам, дзеці ніжэйшых чыноў таксама гулялі... асобна. Ты не была ні з тымі, ні з другімі. Ён павінен быў пакінуць армію.

**Анка.** Што з ім здарылася?

**Палкоўнік.** Ён застрэліўся. Каля цэтадэлі. Недалёка ад горада, дзе калісьці павесілі Траўгута. Нібы яму прыпісалі нейкую хваробу. Я не правяраў. Мне... хапіла. Я забіў аднаго з лепшых людзей, якіх сустракаў у жыцці. І ўсё. Ты мне даруеш?

**Анка.** Не.

**Палкоўнік.** Добра.

**Анка.** Нічога не прашу. Можаце мяне... не праводзіць. Будзе вам ваш Нюрнберг.

**Палкоўнік.** Камунізм такі. У кожным чалавеку квітнее горшае.

**Анка.** Знайшоўся справядлівы суддзя.

## Сцэна 4

*Той самы пакой, але некаторых прадметаў няма: гадзінніка з кукушкай, талерак з Влоцлафка, матрошак. На падлозе стаяць абклееныя скотчам кардонкі. Святлее, ўсе дзверы адчынены. З серабрыстага мініярадыё ціха ліецца музыка – збор ваенных маршаў. Зніклі ўсе засаўкі. Жонка, значна маладзейшая за Палкоўніка, ідзе з Анкай па памяшканні. Яны выходзяць з пакоя, на якім калісьці віселі замкі. Жонка ў лёгкай жалобе.*

**Жонка.** Тут мы з мужам збіраліся прабіць акно ў кухню, гэта звычайная сцяна, не апорная. Хацелі зрабіць нешта накшталт сталовай. Падлога новая, дыхтоўная. Кабельнае тэлебачанне... мы, вядома, плацілі за кадзіраванне, але гэта вам вырашаць, як хочаце. Трубы мянялі летась, цяпер можаце сорак гадоў жыць спакойна. Планавалі балкон зашкліць, там вялікая лоджыя, можна нават аранжэрэю зрабіць. З нашым кліматам, самі разумееце, адкрыты балкон без патрэбы.

**Анка.** І колькі б гэта каштавала?

**Жонка.** О! Вось і кава гатовая.

*Жонка падыходзіць да апарата, дастае пачак кавы, ставіць на стол, з шафкі вымае кубачкі, цукарніцу, ставіць на столік. Садзяцца.*

**Анка.** Харошы апарат.

**Жонка.** Муж купіў мне на Дзень Народзінаў.

**Анка.** Мабыць, каштаваў... ого-го...

**Жонка.** Суседзі спакойныя, ўсе свае. Усе карэнныя варшавяне. Большасць мае вышэйшую адукацыю. Жыллёвае таварыства клапоціцца і сочыць, каб не было выпадковых людзей. Калі ласка, частуйцеся. Наняць кватэру цяпер немагчыма... самі разумееце, в’етнамцы – гэта проста чума. Таварыскія агенцтвы таксама. Побач ёсць парк, можна з сабачкам гуляць, ці з дзіцяткам. Дзіцячы садок, дзяржаўны, зусім каля дому, вельмі харошы, а побач ёсць яшчэ адзін, прыватны, калі раптам спатрэбіцца.

**Анка.** І колькі гэта каштуе?

**Жонка.** Я вам мэблю пакідаю... на кухні ёсць усё, нават тэлевізар. Калі ласка, вось цукар...

**Анка.** Дзякуй, я без цукру.

**Жонка.** Як гэта... без цукру?

**Анка.** Проста... без цукру.

**Жонка.** Упершыню бачу чалавека, які не кладзе цукар у каву.

**Анка.** Мне і так смачна, а вось ад вяршкоў не адмоўлюся.

**Жонка.** Вяршкі, вяршкі, вяршочкі? А як жа, у халадзільніку ёсць. *(Падыходзіць да халадзільніка, што стаіць на кухні, дастае з яго збаночак з вяршкамі, вяртаецца)* Як я вам і гаварыла па тэлефоне, дзве з паловай тысячы за метр. У мяне ўжо ёсць кліенты, якія адразу гатовыя даць дзве чатырыста, але яны нейкія... рамеснікі. У іх свой магазін. А мне хацелася б, каб быў хто-небудзь з інтэлегенцыі. Можа, вы хворая?

**Анка.** Добрая кава. Не, я не хварэю на дыябет.

**Жонка.** Я не хацела праявіць нетактоўнасць.

**Анка.** Не перажывайце, проста я п’ю каву без цукру.

**Жонка.** Ну так, вы маладыя, можаце сабе дазволіць пакапрызіць, носам пакруціць. Тэлефон мы перапішам на вас.

**Анка.** І колькі атрымліваецца? *(Лічыць на калькулятары ў мабільным тэлефоне)* Сто дзевяноста тысяч. Гэта...

**Жонка.** Але якая кватэра, які раён! Усё блізка, станцыя метро зусім блізенька.

**Анка.** Я не езджу ў метро, у мяне клаўстрафобія.

**Жонка.** Басейн за два крокі ад дома. Да таго ж, я, ведаеце, ўсё ж такі веру ў харошую энергетыку. Нешта ж у сценах застаецца. Мы тут з мужам пражылі шмат шчаслівых гадоў. Такое ўтульнае гняздзечка вам пакідаю...

**Анка.** Вы кудысьці ад’язджаеце?

**Жонка.** Сын угаварыў, каб пераязджала да яго. Ён жыве ў Мельбурне, гэта ў Аўстраліі. У мяне двое ўнукаў. Я лічу... мне хочацца, каб яны захавалі мову продкаў. Будуць аўстралійцамі, але недзе ж і Польшча павінна пасяліцца ў іх маленькіх сэрцайках... праўда?

**Анка.** Ваш муж таксама едзе?

**Жонка.** Не, хіба я не гаварыла вам? Мой муж памёр. Часткова яшчэ і яго смерць падштурхнула мяне паехаць.

**Анка.** Мне… шкада…

**Жонка.** Усе калі-небудзь памруць—лёс. Два месяцы плакала, а потым мне ён прысніўся і сказаў, каб не плакала, што чакае мяне там, дзе ён цяпер…

**Анка.** Ён доўга хварэў?

**Жонка.** Мой муж? Ён увогуле не хварэў. Ніколі. Ён быў, прабачце, прафесійны салдат, афіцэр, палкоўнік. Усё жыццё служыў Айчыне. Няшчасны выпадак. Не бойцеся, ён памёр не тут.

**Анка.** Ваш муж любіў паляўніцтва?

**Жонка.** На жаль. А вы думалі, усе гэтыя трафеі ён на рынку купіў?

**Анка.** Не. Не думала.

**Жонка.** Шкуры таксама вам пакіну.

**Анка.** Прыгожыя шкуры.

*Няёмкая паўза.*

**Анка.** Знаёмы маіх бацькоў таксама падстрэліў сябе на паляванні. У сонную артэрыю. Сплыў крывёю.

**Жонка.** Не, мой муж не сам сябе падстрэліў. Ён дужа добра страляў, каб з ім магло здарыцца што-небудзь падобнае.

**Анка.** Дык што здарылася?

**Жонка.** Ён паехаў разам з сябрам. Было ў яго дрэннае прадчуванне перад гэтым паляваннем, але той яго ўгаварыў. Дарэчы, вельмі прыстойны чалавек. Таксама афіцэр-адстаўнік, з паветранага дэсанта. Я экзамен яму здавала, каб атрымаць вадзіцельскія правы. З першага разу здала…

*Анка гучна ставіць кубачак на стол, папярхнулася. Жонка ўсхопліваецца, пачынае стукаць яе па спіне. Анка паказвае жэстамі, што хопіць.*

**Жонка.** Што здарылася? Усё ў парадку?!

**Анка.** Прайшло…

**Жонка.** Я ж вам казала, каб цукру ўзялі. Ад салодкага ніколі б такога не было.

**Анка.** Ужо прайшло, усё добра. І гэты сябар застрэліў вашага мужа?

**Жонка.** Падстрэліў. Яны сядзелі ў засадзе на дзіка па розныя бакі…ледзь днела, ён заўважыў, што нешта заварушылася ў кустах, падумаў—дзік, выстраліў…вось вам і няшчасце.

**Анка.** І што? На гэтым усё і закончылася? Яго неяк пакаралі?

**Жонка.** Умоўна…ды забралі ліцэнзію на зброю. Ведаеце, для яго гэта такая трагедыя… забіць аднаго з сяброў, якіх і так усё менш з кожным годам. Сяброў. Таварышаў па зброі. Старой гвардыі. Адыходзяць самыя лепшыя. З кожным годам усё менш прозвішчаў у запісной кніжцы. Ён

яшчэ ў часы службы быў паранены, кульгаў, давялося пайсці з арміі. Цяжкая служба. І няўдзячная. А гэта ж, дзякуючы ім, гэтым людзям, ужо шэсцьдзесят гадоў мір на Зямлі.

**Анка.** Ну так. Чалавечая трагедыя. Забіць сябра.

**Жонка.** Так. Ну ды хопіць, што гэта мы ўсё пра сумнае? Адно добра, што смерць яго напаткала своечасова.

**Анка.** Гэта ж у якім сэнсе?

**Жонка.** Значыць, такое было яму наканавана. Загінуў, як салдат, як мужчына. Але часам думаю, што здарылася гэта ў патрэбны момант. Бо якраз, калі ён паехаў на паляванне, прынеслі позву з пракуратуры. Уяўляеце, майму мужу, пенсіянеру, позва ў ваенную пракуратуру. У якасці падазронага. Нумар справы, артыкулы. Мне паштальён толькі паказаў, гэта было заказное пісьмо.

**Анка.** Можа, памыліліся.

**Жонка.** На жаль, не. У мяне знаёмыя у пракуратуры. Нехта напісаў данос, што ён злачынец, які ў Народнай Польшчы не можа застацаа беспакараным. Нейкія жудасныя рэчы. А потым прыслалі паперку, у якой напісана, што крымінальная справа спынена, з прычыны смерці падазронага. Падазронага, разумееце? Вы можаце сабе гэта ўявіць? Данос на такога чалавека?

**Анка.** У такім выпадку, можа і сапраўды добра, што ён не дачакаўся.

**Жонка.** Ён быў выдатным афіцэрам, сапраўдным палякам. Калі б вы чулі прамовы на пахаванні. Я ўсе вочы выплакала. А калі ганаровая варта салютавала ў гонар яго, плакала не адна я. Мазурка Дамброўскага гучала. І пасмяротна Камандорскі крыж ордэна адраджэння Польшчы. Polonia Resistuta. Унукам завязу ўсе медалі. Хай ведаюць, што дзядуля быў заслужаным палякам.

**Анка.** Правільна, хай ведаюць. А чаму ваш сын паехаў з Польшчы?

**Жонка.** Ну ведаеце, за вамі, маладымі, не ўгледзіш. Хто яго ведае? Жонка, мусіць, угаварыла. У нас нават праблемы былі праз іх…яны ў Італіі ўцяклі проста з экскурсіі. Сто восемдзесят тысяч і… кватэра ваша.

**Анка.** Баюся, што гэта ўсё роўна дужа дарага для мяне. Хаця, калі шчыра, то я зараз кватэру купляць не збіраюся.

**Жонка.** Тады навошта званілі?

**Анка.** Сёе-тое змянілася. Я лячу ў Штаты на стажыроўку…

**Жонка.** Дык што ж вы мне галаву дурыце? Я іншым кліентам адмовіла. Дзве чатырыста за метр давалі…

**Анка.** Я ж вам якраз і прыйшла пра гэта сказаць, але кватэра мне вельмі даспадобы. Падумала так: можа, калі вярнуся праз чатыры месяцы…

**Жонка.** Я не магу столькі чакаць.

**Анка.** Прабачце, што задурыла вам галаву.

**Жонка.** Ай, ды што ўжо…нічога…

*Усталі, падыходзяць да дзвярэй, стаяць…*

А стажыроўку нельга перанесці?

**Анка.** Ой, не …у мяне дамоўленасць на практыку ў сур'ёзнай рэдакцыі, на CNN, сустрэчы з Джымі Картэрам… там было некалькі дзесяткаў кандыдатаў, я і падумаць не магла, што мяне выберуць. У вас быў сабака?

**Жонка.** Так, быў. У мужа быў ганчак. Медалі атрымліваў на выставах. А адкуль вы ведаеце?

**Анка.** Убачыла ў пакоі падсцілку і міску.

**Жонка.** Я яшчэ не зусім прыбралася… тут такі бардак…

**Анка.** Вы яго аддалі?

**Жонка.** Збіралася аддаць. Ёсць адзін добры прыватны гадавальнік. Ён бы хутка знайшоў сабе новага гаспадара, наш Трыстан. Ды нехта падкінуў у пад'езд атручаныя сасіскі. А ён так любіў сасісачкі… за сасісачку што хочаш: і сядзець, і голас, і апорт…

**Анка.** І што ж, паліцыя нікога не злавіла?

**Жонка.** Ці не дваццаць сабак, уяўляеце, за адзін вечар! Будзе паліцыя сабе галаву тлуміць мёртвымі сабакамі? Найбольш верагодна, што гэта падлеткі…эксперыментавалі. Вы журналістка? А я ўсё думаю, адкуль гэта мне ваша прозвішча …нібыта знаёмае. Ну, вядома ж, Міхал Візнер! Ці не сваяк ён вам?

**Анка.** Не…так… ён мой бацька.

**Жонка.** Бацька? Ды што вы?! Міхал жа быў найбліжэйшым сябрам майго мужа. Так бы мовіць, малодшым таварышам. Мой муж клапаціўся пра яго, асабліва, калі ў Міхала пачаліся праблемы. Ведаеце…тады, на верфі, гэта па-рознаму можна было трактаваць…пагаворвалі нават пра ваенны суд. Самі разумееце, што гэта значыць. А мой Стэфан яго абараніў! Хаця, гэта ён павінен быў рабіць гэтую работу. Ужо падпалкоўнікам быў, у танку не сядзеў з аперацыі "Дунай", а тады ў першым танку павінен быў уз'ехаць на верф. Там усё, што хочаш, магло здарыцца… У іх жа, гэтых бандытаў з Салідарнасці, былі напагатове бутэлькі з ацатыленам, з бензінам. А бацьку твайго ён потым абараняў як мог. Казаў яшчэ: ўсё помню, не веру, што маці Міхала немка і што ён агент ГРУ.

**Анка.** Ён так гаварыў?

**Жонка.** Нават самому Міхалу сказаў. І сказаў, што можна на яго разлічваць, калі што якое.

**Анка.** Калі што?

**Жонка.** Не ведаю. Але казаў. Пры мне. Але ж нават гэта яго не вырагавала. Ён ужо тады, напэўна, задумваў самагубства. На наступны ж дзень і…застрэліў сябе. Дзетанька мая, мне так шкада… *(Падыходзіць, абдымае Анку, моцна прыціскае да сябе. Анка не* рэагуе) Магу ўявіць,

што ты тады перажыла. Такі шрам на ўсё жыццё. Я прадам табе гэтую кватэру. Калі захочаш. Я пачакаю. Трэба дапамагаць адна адной…

**Анка.** Не, я не хачу тут жыць. Не трэба дапамагаць адна адной! Я не хачу тут жыць…

*Заслона*

***На беларускую мову з рускай пераклаў Андрэй Каляда.***